

У ПЯТНАЦЦАЦЬ ЯНА СКАРЫЛА ГАЛІВУД

ЧЫРВОНКА

БІЗНЕС — СА ШКОЛЬНАЙ ЛАЎКІ

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 СТУДЗЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 15 (28882)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ДВОРНІК, старшыня Гомельскага аблвыканкама:**

*«Прамысловасці ў рэгіёне аддаецца асаблівая ўвага: 21—22 % ад усёй прампрадукцыі, што выпрацоўваецца ў Беларусі, выпускаецца ў Гомельскай вобласці. У цэлым сёлета прамысловая сфера нацэлена на дасягненне самых высокіх вынікаў. Так, павінен набраць магутнасці Светлагорскі ЦКК. Плануецца, што да канца года першую партыю калійнай прадукцыі атрымаем на Петрыкаўскім радовішчы. У сукупнасці гэта павялічыць прамысловы патэнцыял вобласці, што ў сваю чаргу дасць магчымасць павысіць узровень жыцця людзей. Зараз у рэгіёне функцыянуюць каля 300 буйных прадпрыемстваў, а з улікам малых і сярэдніх гэтая лічба дасягае адной тысячы».*



# СВЕТ І СВЯТЛО ЗАМЕРЗЛАЙ ВАДЫ

**Чацвёртакурснікі Беларускай акадэміі мастацтваў аддзялення скульптуры Галіна БЛАГАРЭНКА і Лізавета РОЗЕНБЕРГ удзельнічаюць у пятым фестывалі-конкурсе лядовых і снежных скульптур «Свет крышталяў у Батанічным садзе». Стварэнне мастацкіх твораў з лёду і снегу пачалося толькі ўчора, але ўжо ў абрысах будучай скульптуры дзяўчат угадваецца птушка, здаецца, звычайны верабейка. Але мы не будзем раскрываць усе таямніцы гэтай дзівоснай імпрэзы: у суботу адбудзецца адкрыццё экспазіцыі ўсіх твораў і наведвальнікі ўбачаць вобразы, зробленыя з дапамогай застылай вады. Дададзім, што ў конкурсе прымаюць удзел прафесіянальныя скульптары, навучэнцы каледжаў і студэнты Акадэміі мастацтваў. Агляд ледзяных фігур, калі паспрыяе надвор'е, будзе праходзіць да трэцяга лютага.**

**На сайце «Звязды» можна ўбачыць, як працуюць удзельнікі фестывалю «Свет крышталяў».**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• У Міжнародны дзень без інтэрнэту, 27 студзеня, у Мінскім заапарку па адным білеце зможа прайсці два чалавекі. Для дзяцей да пяці гадоў наведванне бясплатнае.

• **Да 1 верасня будзе выдадзена 18 новых навучальных дапаможнікаў для 9 класа. Падручнікі выдаюцца ў сувязі з абнаўленнем навучальных праграм.**

• Усіх студэнтаў пры высяленні з інтэрнатаў у сувязі з Еўрапейскімі гульнямі забяспечаць жыллём.

• **Снежныя фігуры ўпрыгожылі плошчу Перамогі ў Віцебску. Іх стварылі педагогі абласнога цэнтра падчас конкурсу «Снежная феерыя — 2019».**



ISSN 1990 - 763X

Сацыяльны праект

## Ад вяленых таматаў да чырвонай рыбы

### Як выратаваць прадукты ад выкідвання на сметніцу

**По статыстыцы, беларусы выкідаюць 30 працэнтаў ежы, якую купляюць. Колькі харчовых адходаў утвараюць крамы і вытворцы, дакладна невядома. Часта на сметніцу яны адпраўляюць не толькі пратэрмінаванае, але і проста прадукты нетаварнага выгляду: памятыя кансервы ў бляшанках, падгарэлыя булачкі. Хоць іх, магчыма, пагадзіліся б забраць небагатыя сем'і. Для гэтага ў краіне ствараюць харчовы банк: арганізацыя будзе атрымліваць ад гандлёвых сетак «непрыгожыя», але якасныя прадукты (ці тыя, у якіх хутка скончыцца тэрмін прыдатнасці) і перадаваць іх людзям, што маюць патрэбу.**

Падобныя банкі ўжо працуюць за мяжой. Напрыклад, летась у Літве ўдалося пераразмеркаваць восем тысяч тон прадуктаў на суму 20 мільёнаў еўра. А Берлінскі харчовы банк атрымлівае з крам каля тысячы тон ежы ў месяц, з якіх 660 раздае гараджанам. **Алена ПІШЧУК, адна з ініцыятараў мінскага праекта,** натхнілася гэтым вопытам і вырашыла прывезці яго ў нашу краіну.

— Сяброўка расказвала, як працавала ў дастаўцы прадуктаў. Там, каб пазбегнуць канфліктных сітуацый з пакупнікамі, перастрахоўваюцца і выкідаюць усё, што хоць мінімальна не адпавядае нормам, — звяртае дзяўчына ўвагу на праблемы. — А ў крамах, калі нешта адбракоўваецца, гэта не размяркоўваюць сярод сваіх па адной простай прычыне: каб не было карупцыі і крыўдаў, чаму аднаму супрацоўніку далі, а другому — не.

СТАР. 4

Год малой радзімы

## МУЗЕЙ ЁСЦЬ — ГАСПАДАРА НЯМА

### Як захаваць памяць і спадчыну адной асобна ўзятай вёскі

**Былая стараста вёскі Гарадзішча Слуцкага раёна Яўгенія Сыцько вельмі любіла сваю малую радзіму. Яўгенія Васілеўна жыла яе мінулым, сучасным і думала пра будучыню, пра тое, каб нашчадкі ведалі свае карані, спазнавалі самабытную спадчыну продкаў, гісторыю роднага краю. Яна шмат зрабіла, каб родны кут стаў больш прыгожым, утульным, камфортным для жыцця. Менавіта дзякуючы Яўгеніі Васілеўне ўладкаваны парк, агароджаны могілкі, пабудавана капліца, заменены стары помнік зямлячцы Марыі Грак, якая дапамагала партызанам падчас Вялікай Айчыннай вайны і была расстраляная фашыстамі.**

СТАР. 13

У этнаграфічным пакоі.



МЭТЫ устойлівага развіцця БЕЛАРУСІ

Актуальнае інтэрв'ю

Мар'яна ШЧОТКІНА:

# «Устойлівае развіццё залежыць ад кожнага з нас»

**Сёння ў сталіцы распачаўся першы Нацыянальны форум па ўстойлівым развіцці. Ён сабраў больш за 400 чалавек. Аб праграме і асаблівасцях мерапрыемства, а таксама аб перспектывах пашырэння работы, якая праводзіцца ў Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця (МУР), у інтэрв'ю БелТА расказала намеснік старшыні Савета Рэспублікі, нацыянальны каардынатар па МУР Мар'яна ШЧОТКІНА.**



***— Мар'яна Акіндзінаўна, рэзалюцыя Генасамблеі ААН «Пераўтваранне нашага свету: Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года» і зафіксаваныя ў ёй 17 Мэт устойлівага развіцця былі прыняты ў верасні 2015 года. Беларусь выказала прыхільнасць да Парадку дня — 2030. Якія захады былі зроблены для яго рэалізацыі на нацыянальным узроўні? Як вы ацэньваеце дасягнутыя вынікі?***

— Прыняцце Парадку дня — 2030 і 17 зафіксаваных у ім Мэт устойлівага развіцця запатрабавала ад усіх дзяржаў перагляду і канкрэтызацыі нацыянальных праграмных дакументаў, а таксама стварэння механізмаў для арганізацыі працэсу па выкананні Мэт, накіраваных на ліквідацыю беднасці, барацьбу з няроўнасцю, вырашэнне праблем, звязаных са змяненнем клімату, і іншых важных пытанняў. Гэта своеасаблівы план па захаванні міру і стабільнасці на планеце.

Беларусь выказала прыхільнасць да Парадку дня — 2030 і зрабіла шэраг важных захадаў для яго рэалізацыі на нацыянальным узроўні. Работа, якая праводзіцца ў краіне па дасягненні МУР, знаходзіцца на асабістым кантролі Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, што падкрэслівае асаблівую значнасць гэтага пытання для краіны.

У маі 2017 года ў Беларусі былі сфарміраваны інстытуцыянальныя асновы для кіравання работай у галіне рэалізацыі МУР. Заснавана пасада нацыянальнага каардынатара па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Выбудавана нацыянальная архітэктура кіравання працэсам дасягнення МУР. Яна ўключае Савет па ўстойлівым развіцці, парламенцкую, рэгіянальныя і партнёрскую групы ўстойлівага развіцця, якія забяспечваюць эфектыўнае ўзаемадзеянне дзяржаўнага сектара з грамадскімі арганізацыямі, навуковымі коламі, бізнес-супольнасцю, міжнароднымі партнёрамі. У адпаведнасці з рашэннем Савета па ўстойлівым развіцці кожная з 17 МУР замацавана за дзяржаўнымі органамі, у кампетэнцыю якіх уваходзіць вырашэнне адпаведных пытанняў. Пры гэтым усе задзейнічаныя дзяржаўныя органы ўваходзяць у склад чатырох галіновых блокаў: эканоміка, экалогія, сацыяльная сфера, маніторынг. Гэта забяспечвае дакладны ўлік і каардынацыю работы па дасягненні МУР.

Па меры фарміравання архітэктуры кіравання працэсам дасягнення МУР у Беларусі арганізавана работа па забеспячэнні маніторынгу паказчыкаў дасягнення Мэт, якую ўзначальвае Нацыянальны статыстычны камітэт. Наладжана ўзаемадзеянне з міжнароднымі партнёрамі па пытаннях дасягнення глабальных Мэт.

З улікам афармлення сістэмы інстытутаў па рабоце ў галіне ўстойлівага развіцця, а таксама важнасці забеспячэння іх сумеснай дзейнасці, у тым ліку пры распрацоўцы стратэгічных дакументаў у сферы ўстойлівага развіцця, наспела неабходнасць правядзення агульнанацыянальнага мерапрыемства для ўсебаковага разгляду пытанняў дасягнення МУР з удзелам усіх уключаных у гэты працэс бакоў.

***— Які парадак дня першага Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці? У чым яго асаблівасці?***

— Форум пройдзе пад дэвізам «Ва ўстойлівую будучыню — разам!». Мерапрыемства дасць магчымасць прааналізаваць работу ў сферы дасягнення МУР, праведзеную ў краіне пасля прыняцця Парадку дня — 2030, разгледзець бягучую сітуацыю ў галіне ўстойлівага развіцця, намеціць стратэгічныя, інстытуцыянальныя і практычныя арыенціры далейшай дзейнасці на кароткатэрміновую-, сярэдне- і доўгатэрміновую перспектывы.

Цяпер ідзе работа па імплементацыі паказчыкаў МУР у Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця да 2030 года, рэспубліканскія, галіновыя, рэгіянальныя праграмы рознага ўзроўню. Ключавым напрамкам далейшай работы па нацыяналізацыі Мэт павінна стаць іх імплементацыя ў Нацыянальную стратэгію ўстойлівага развіцця на перыяд да 2035 года. Над гэтым дакументам праведзена ўжо вялікая работа, і праект яго канцэпцыі стане адной з тэм для абмеркавання на форуме. У ім прымуць удзел больш за 400 чалавек. Гэта прадстаўнікі дзяржаўных органаў, парламента, навукі і адукацыі, бізнесу, грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў і іншыя зацікаўленыя. Вельмі важны ўдзел у форуме рэгіянальных груп па дасягненні МУР. Мы разумеем, што планы развіцця тэрыторый павінны прапаноўвацца перш за ўсё прадстаўнікі органаў мясцовага кіравання з улікам патрэбнасцяў і інтарэсаў грамадзян. Устойлівае развіццё раёнаў, гарадоў, сельскіх тэрыторый — гэта аснова ўстойлівага развіцця рэгіёнаў і, як вынік, — краіны ў цэлым. Удзельнікамі будучага мерапрыемства стануць прадстаўнікі агенцтваў ААН і міжнародныя эксперты. Спецыяльна да нас на форум з Нью-Ёрка прыляціць памочнік Генеральнага сакратара ААН, дырэктар рэгіянальнага бюро ПРААН па Еўропе і краінах СНД Мір'яна Сполярчы Эгер. Яе візіт у Беларусь стане першым краінавым візітам на гэтай пасадзе.

На форуме будзе прадстаўлены нацыянальны вопыт Беларусі па дасягненні Мэт устойлівага развіцця. Панэльныя дыскусіі пройдуць па некалькіх тэматычных напрамках: устойлівы эканамічны рост як умова забеспячэння высокага ўзроўню жыцця беларускага народа; гарантаванне экалагічнай бяспекі, захаванне і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў; паляпшэнне якасці жыцця праз здароўе, запатрабаваную адукацыю, дастойную работу; сістэма маніторынгу і ацэнкі імплементацыі Мэт устойлівага развіцця.

Будуць абмеркаваны магчымасці больш эфектыўнага выкарыстання патэнцыялу ўзаемадзеяння грамадства, бізнесу і ўлады для ўстойлівага развіцця, роля прадпрымальніцтва ва ўстойлівым развіцці рэгіёнаў, перспектывы глабальнага партнёрства. Размова пойдзе аб мерах па барацьбе са змяненнем клімату, рацыянальным выкарыстанні водных рэсурсаў, уключэнні ў гаспадарчы абарот другасныx сыравіны. У цэнтры ўвагі будуць таксама пытанні эфектыўнай занятасці, пашырэння правоў людзей з абмежаванымі магчымасцямі, гендарнай роўнасці і інш. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена пытанням лічбавізацыі як драйвера эканамічнага росту. Асобна абмяркуем трансфармацыю энергетычнай сістэмы.

У час форуму будзе прэзентавана Нацыянальная платформа па прадстаўленні справаздачнасці па Мэтах устойлівага развіцця — як асноўны інструмент для маніторынгу і распаўсюджвання даных аб індыкатарах Мэт. Упершыню для маніторынгу дасягнення МУР плануецца выкарыстоўваць касмічныя тэхналогіі.

Для нас вельмі важны ўдзел моладзі ў працэсе дасягнення Мэт устойлівага развіцця. На форуме адбудзецца цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў конкурсу «Маладзёжныя пасты Мэт устойлівага развіцця — будучыня планеты ў нашых руках!». Гэта актыўныя маладзёжныя лідары, дзейнасць якіх будзе садзейнічаць рэалізацыі Нацыянальнай стратэгіі ў галіне МУР. Усяго ў конкурсе прынялі ўдзел больш за 200 студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі.

Акрамя таго, будуць узнагароджаны пераможцы конкурсу «Супергероі для супермэт», накіраванага на павышэнне дасведчанасці моладзі аб Мэтах устойлівага развіцця і ўключэнне маладых людзей у работу па іх папулярызацыі. На конкурс было прадстаўлена больш за 500 работ — ілюстраваных гісторый па тэматыцы МУР. У іх маладыя людзі прадставілі сваіх супергерояў.

***— Развіццё супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі — найважнейшы аспект для дасягнення МУР. Як Беларусь узаемадзейнічае ў гэтым плане з ААН і іншымі міжнароднымі арганізацыямі? Ці ёсць планы па рэалізацыі новых сумесных праектаў, ініцыятыў?***

— Мы актыўна працуем з краінавай камандай ААН, пастаянным каардынатарам ААН у Беларусі Іааннай Казана-Вішнявецкі. Наша краіна адкрыта для супрацоўніцтва. Зусім не выпадкова апошняя, 17-й Мэтай з'яўляецца партнёрства ў інтарэсах устойлівага развіцця. Узаемадзеянне з нашымі партнёрамі забяспечвае выніковасць сумеснай работы. Вельмі важна, што гэта тэматыка не палітызавана, яна накіравана на паляпшэнне жыцця людзей.

Добрым прыкладам у гэтым напрамку стала партнёрства з экспертна-кансультацыйнай місіяй MAPS («Інтэграцыя, паскарэнне і падтрымка палітыкі»). У склад місіі ўвайшлі эксперты ПРААН, ЮНІСЕФ, Дэпартамента ААН па эканамічных і сацыяльных пытаннях, ЮНФПА (Фонд ААН у галіне народанасельніцтва), МАП (Міжнародная арганізацыя працы), СААЗ (Сусветная арганізацыя аховы здароўя) і Сусветнага банка, якія ў лістападзе — снежні 2017 года правялі ў Беларусі сустрэчы з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі, бізнесам для аналізу дасягненняў краіны ў галіне ўстойлівага развіцця ў гэтай сферы.

Сутнасць высноў місіі MAPS у тым, што Беларусь дасягнула значных поспехаў на ўстойлівым развіцці з моманту станаўлення сваёй незалежнасці. У Дакладзе аб чалавечым развіцці 2016 года Беларусь заняла 52-е месца сярод 188 краін і ўвайшла ў групу краін з «даходамі, вышэйшымі за сярэдні ўзровень». Адной з ключавых асаблівасцяў беларускай палітыкі ў галіне развіцця з'яўляецца яе моцная сацыяльная арыентаванасць нароўні са значнай зацікаўленасцю ў тэхнічных інавацыях і ўзятым у краіне курсам на развіццё рыначнай эканомікі. Па выніках сумеснай работы Савета па ўстойлівым развіцці і місіі MAPS вызначаны платформы паскарэння рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця. Гэта пункты росту, укладанне чалавечых і фінансавых інвестыцый у якія будзе накіравана на дасягненне комплексу ўзаемазвязаных Мэт.

Высокую ацэнку дзейнасці па дасягненні МУР, якая праводзіцца ў Беларусі, далі і эксперты саміту Сусветнага эканамічнага форуму па ўстойлівым развіцці, што прайшоў у Нью-Ёрку ў кастрычніку 2018 года і быў прымеркаваны да адкрыцця 73-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Беларусь была запрошана на саміт упершыню.

У планах — далейшае пашырэнне супрацоўніцтва з міжнароднымі партнёрамі. Акрамя арганізацыі мы хацелі б узаемадзейнічаць на гэтым напрамку з іншымі міжнароднымі гульцамі, уключаючы буйныя кампаніі, якія гатовы працаваць на карысць устойлівага развіцця.

У найбліжэйшы час ва ўзаемадзеянні з нашымі міжнароднымі партнёрамі плануем запусціць сумесны праект «Падтрымка намаганняў Рэспублікі Беларусь у нацыяналізацыі і лакалізацыі Мэт устойлівага развіцця». Работа будзе ісці па некалькіх напрамках: падтрымка функцыянавання нацыянальных механізмаў па імплементацыі і пашырэнні МУР; садзейнічанне ў распрацоўцы нацыянальных і рэгіянальных дакументаў прагназавання і планавання з улікам МУР; садзейнічанне ў стварэнні эфектыўнай сістэмы маніторынгу рэалізацыі Мэт на нацыянальным і мясцовым узроўнях; кіраванне ведамі, маніторынг і ацэнка.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### «Шатдаўн» перашкаджае агентам ФБР?

Бюджэтны крызіс, які працягваецца ў ЗША ўжо чацвёрты тыдзень, не толькі прывёў да закрыцця дзяржаўных музеяў, паркаў і да прыпынення работы шэрагу ключавых федэральных ведамстваў, але і стварае перашкоды для дзейнасці агентаў Федэральнага бюро расследаванняў (ФБР), якія ў тым ліку задзейнічаны ў контртэрарыстычных аперацыях. Пра гэта гаворыцца ў дакладзе Асацыяцыі агентаў ФБР, апублікаваным учора.

У ім прыводзіцца серыя ананімных каментарыяў супрацоўнікаў ведамства, якія працуюць на розных напрамках і ў розных рэгіёнах краіны. У прыватнасці, некаторыя адзначылі, што так званы шатдаўн падрывае магчымасці агентаў ФБР у належнай меры абараняць амерыканскіх грамадзян. «Падрыхтоўка да канкрэтных аперацый па рэагаванні на надзвычайныя здарэнні была або перанесена на больш позні тэрмін, або зусім адменена ў студзені, і гэта працягваецца не адзін тыдзень з-за адсутнасці бюджэтных сродкаў. Гэта негатыўна адбіваецца на магчымасці выконваць нашу працу і абараняць амерыканскі народ», — прыводзіцца ў дакладзе словы супрацоўніка групы рэагавання на надзвычайныя здарэнні.

### Новы ўрад Латвіі

Сейм (парламент) Латвіі зацвердзіў у сераду на пазачарговым пасяджэнні склад новага ўрада рэспублікі на чале з прэм'ер-міністрам ад партыі «Новае адзінства» Крыш'янісам Карыньшам.

Гэтая палітычная сіла па выніках парламенцкіх выбараў заручылася найменшай падтрымкай выбаршчыкаў і заняла апошняе, сёмае месца.

Тады кіруючу кааліцыю ў Латвіі дамовіліся стварыць пяць партый. Кандыдатуру Карыньша — ураджэнца ЗША, уладальніка двайнога грамадзянства і былога дэпутата Еўрапарламента ад рэспублікі — на пасаду прэм'ера і вылучылі палітычныя сілы, якім удалося сфарміраваць кіруючую кааліцыю.

### Трагедыя ў Керчанскім праліве: танкеры, якія загарэліся, знаходзіліся пад санкцыямі ЗША

Танкеры «Маэстра» і «Кандзі», якія хадзілі пад сцягам Танзаніі і загарэліся 21 студзеня ў раёне Керчанскага праліва, знаходзіліся ў санкцыйным спісе ЗША, паведаміла агенцтва Reuters.



Як заявілі ў мінфіне ЗША, кампаніям, якія будуць супрацоўнічаць з суднамі, што трапілі пад абмежаванні, таксама пагражаюць штрафныя меры. Паводле інфармацыі Reuters, уладальнікі газавага тэрмінала «Мактрэн-Нафта» забаранілі танкеру «Маэстра» падысці да прычала ў порце Цямрук у Краснадарскім краі. У сувязі з гэтым экіпажы паспрабавалі ажыццявіць прамую перапампоўку паліва з судна на судна. Выкананне гэтай рызыкоўнай аперацыі падчас шторму, відаць, і стала прычынай пажару.

Паведамлялася, што на двух танкерах знаходзіліся 34 чалавекі — грамадзяне Турцыі і Індыі. Паводле апошніх звестак, 14 маракоў былі выратаваны, 10 прызнаныя загінулымі і яшчэ 10 — зніклі без вестак. Па звестках Reuters, уласнікам абодвух танкераў з'яўляецца турэцкая кампанія Milenyum Denizcilik Gemi, якая трапіла пад амерыканскія санкцыі ў 2015 годзе за арганізацыю паставак звадканага нафтавага газу і дызельнага паліва ў раёны, якія кантралююцца сірыйскім урадам.

Прыярытэты

# 1020 РУБЛЁЎ ЗА «КВАДРАТ»

## Урад вызначыў найважнейшыя мэтавыя паказчыкі заказчыкаў дзяржпраграм

**Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 22 студзеня 2019 года зацверджаны найважнейшыя мэтавыя паказчыкі заказчыкаў дзяржаўных праграм на 2019 год, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

У прыватнасці, Міністэрству архітэктуры і будаўніцтва даведзена забеспячэнне на канец гэтага года сярэдняга кошту 1 кв. м агульнай плошчы жылля, якое будуецца з дзяржаўнай падтрымкай (без індывідуальных забудоўшчыкаў), у памеры Br1020. Доля агульнай плошчы шматкватэрных энергаэфектыўных жылых дамоў у агульным аб'ёме ўведзенага ў эксплуатацыю жылля (без уліку індывідуальных жылых дамоў) павінна скласці 90 працэнтаў.

Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі павінна сёлета забяспечыць зніжэнне выдаткаў на аказанне жыллёва-камунальных паслуг насельніцтву ў супастаўных умовах не менш чым на пяць працэнтаў у параўнанні з 2018 годам. Для Міністэрства лясной гаспадаркі ўстаноўлены аб'ём нарыхтоўкі драўніны з аднаго гектара лясных плошчаў — 2,45 куб. м, а таксама забеспячэнне лясістасці тэрыторыі не меншай за 39,9 працэнта.

Міністэрству сельскай гаспадаркі і харчавання даручана забяспечыць значэнне сумы крэдыторскай запазычанасці і запазычанасці па крэдытах і пазыках да выручкі ад рэалізацыі прадукцыі, тавараў, работ, паслуг у сельскагаспадарчых арганізацыях не большае за 1,02 працэнта на канец года. Удзельная вага аўтамабільных дарог з цвёрдым пакрыццём у агульнай працягласці аўтамабільных дарог агульнага карыстання павінна скласці 86,7 працэнта.

Згодна з дакументам, узровень зарэгістраванага беспрацоўя да канца 2019 года не павінен перавысіць адзін працэнт. Чаканая працягласць жыцця складзе 75 гадоў. Долю айчынных лекавых сродкаў на ўнутраным рынку ў цэнасным выражэнні плануецца давесці да 54 працэнтаў.

Таксама пастаўлена задача ўвайсці ў топ-30 па індэксе ўзроўню адукацыі ў рэйтынгу краін па індэксе чалавечага развіцця. Нацыянальная акадэмія навук адказвае за забеспячэнне ўдзельнай вагі інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме прадукцыі (паслуг). Яна павінна скласці 15,9 працэнта.

Колькасць абанентаў і карыстальнікаў стацыянарнага шырокапалоснага доступу да сеткі інтэрнэт на канец года павінна скласці 34,2 адзінкі на 100 чалавек. Сярод паказчыкаў, даведзеных да Міністэрства спорту і турызму, — экспарт турыстычных паслуг. Яго аб'ём да канца года павінен скласці $240 млн. У спартыўным рэйтынгу на сусветнай арэне па алімпійскіх дысцыплінах да канца 2019 года Беларусь павінна ўвайсці ў топ-25.

Сярод паказчыкаў, устаноўленых для аблвыканкамаў, — змяншэнне прэтэнзій на якасць жыллёва-камунальных паслуг, зніжэнне выдаткаў на іх аказанне насельніцтву ў супастаўных умовах да папярэдняга года, нарматыў замены цеплавых сетак, увод агульнай плошчы жылых дамоў пасля капітальнага рамонту, замена і мадэрнізацыя ў жылых дамах ліфтаў, якія адпрацавалі нарматыўныя тэрміны эксплуатацыі, забеспячэнасць спажыўцоў водазабеспячэннем пітной якасці.

**Ул. інф.**

# ЧЫМ СКЛАДАНЕЙ, ТЫМ — ЛЕПШ!

## Удзельнікі каманды «МАЗ-СПОРТаўта» падвялі вынікі «Дакара-2019»

**Сёлетні «Дакар» стаў самым складаным ралі-рэйдам, у якім толькі даводзілася ўдзельнічаць, адзначаюць беларускія пілоты. Нягледзячы на невялікі лік этапаў — усяго 10, маршрут праходзіў па пясчаных участках з дзюнамі і зыбучым «фэш-фэшам». Гоншчыкі пераадолелі каля пяці тысяч кіламетраў па пустынях, горных скалах і высахлых рэчышчах. Многія экіпажы захрасалі ў варонках і губляліся ў навігацыі, а тэхніка часта выходзіла са строю проста на трасах.**



Фота БелТА.

Выключэннем не стала і наша каманда, у пастках з пяску пабывалі ўсе тры беларускія экіпажы, але змаглі выбрацца з іх самі альбо пры дапамозе партнёраў па камандзе. Два беларускія экіпажы завяршылі ралі-рэйд у першай дзясятцы самых хуткіх грузавікоў, МАЗ Сяргея Вязовіча стаў шостым, камiён Аляксандра Васілеўскага заняў восьмае месца, на 11-м радку размясціўся экіпаж Аляксея Вішнеўскага.

— *У Перу былі вельмі высокія пяскі, вельмі цяжкая па праходнасці траса, але нашы аўтамабілі дазваляюць ехаць па такіх дарогах без спыненняў, не захрасаць. Мы на такіх участках не з'яўляемся адназначнымі лідарамі, але беларускія грузавікі дазваляюць бесперашкодна праходзіць гэтую трасу, калі не дапускаюць памылкі члены экіпажа,* — расказвае **начальнік і пілот каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргей ВЯЗОВІЧ.** — *Мы дапусцілі шэраг памылак, якія прывялі да страты часу. На жаль, не змаглі непасрэдна прыняць удзел у барацьбе за п'едэстал гэтага «Дакара». Па прычыне тэхнічнай няспраўнасці мы ні разу не спыніліся, усе спыненні былі звязаны з уласнымі памылкамі або памылкамі эксплуатацыі аўтамабіляў. У сапернікаў таксама не ўсё складалася гладка, стартавала больш за 40 грузавікоў, а фінішавала каля 15.*

Адзначым, што «МАЗ» і Iveco — адзіныя, хто праехаў увесь маршрут «Дакара-2019» і не страціў ні аднаго экіпажа.

— *Нас чакае вялікая работа па падрыхтоўцы да наступнага старту, абдумваем усё, што адбылося з намі і з нашымі сапернікамі. У нас ёсць над чым працаваць. Пакуль мы не маем вялікага вопыту па выхадзе са складаных сітуацый з мінімальнай стратай часу,* — адзначыў Сяргей Вязовіч.

Для сезона 2019 года каманда «МАЗ» падрыхтавала новы аўтамабіль капотнай кампаноўкі, яго прэзентацыя прайшла перад адлётам каманды на «Дакар». Плануецца, што праз пару тыдняў пачнуцца яго ўсебаковыя выпрабаванні і далей ён будзе запушчаны ў спаборніцкі працэс.

— *У наступным сезоне ўсе асноўныя тэхнічныя рашэнні будуць накіраваны на аўтамабіль капотнай канфігурацыі. Ён сабраў у сабе ўсе нашы думкі і навіны, як яны будуць працаваць — пакуль вялікае пытанне,* — расказвае начальнік каманды. — *На працягу ўсяго сезона мы будзем катаць гэта аўто, упэўнены, пакуль што ў яго будзе шмат слабых месцаў. Наша задача за 2019 год усе гэтыя слабыя месцы знайсці і ліквідаваць, каб выставіць грузавік на «Дакар-2020» у поўнай баявой гатоўнасці. Не хопіць года, значыць, мы не выставім гэты аўтамабіль на «Дакар», наша задача змагацца там за вынік, а не тэсціравацца.*

Беларуская каманда яшчэ не вызначылася з першым стартам новага сезона, дакладна можна сказаць толькі тое, што ён адбудзецца вясной. У полі інтарэсаў беларусаў ралі ў Казахстане, Туркменістане і Марока.

Нагадаем, каманда «МАЗ-СПОРТаўта» ўдзельнічала ў ралі-рэйдзе «Дакар» ужо восьмы раз. Сёлета марафон прайшоў па тэрыторыі толькі адной краіны — Перу. Акрамя барацьбы за прызавыя месцы, беларусы актыўна дапамагалі сапернікам. Так, МАЗы выцягнулі з пяскоў КамАЗ Айрата Мардзеева, Iveco Жэрара дэ Роя, пазадарожнік літоўца Бенедыктаса Ванагаса і нават матацыкл адной гоншчыцы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# АДМОВА АД ВАКЦЫНАЦЫІ ПАГРАЖАЕ ЧАЛАВЕЦТВУ

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя апублікавала штогадовы спіс з дзесяці глабальных пагроз чалавецтву. У яго ўпершыню трапіў трэнд на свядомую адмову ад вакцынацыі.**

У інфармацыйным паведамленні СААЗ адзначаецца, што нежаданне або адмова ад вакцынацыі, нягледзячы на наяўнасць вакцын, пагражае звесці на нуль прагрэс, дасягнуты ў барацьбе з хваробамі, якія можна папярэдзіць. Вакцынацыя з'яўляецца адным з найбольш эканамічна эфектыўных спосабаў пазбегнуць захворванняў. У цяперашні час яна прадухіляе ад 2 да 3 мільёнаў смерцяў у год.

У справаздачы адзначаецца, напрыклад, рост выпадкаў захворвання на адзёр, які шмат у чым выкліканы адмовай ад вакцынацыі. Ва ўсім свеце захваральнасць на адзёр павялічылася на 30 %. У некаторых краінах, якія былі блізкія да ліквідацыі гэтай хваробы, адбыўся яе ўсплёск.

Прычыны, па якіх людзі вырашаюць не рабіць прышчэпак, складаныя: кансультатыўная група па вакцынах СААЗ адзначае самазаспакоенасць насельніцтва, нязручнасць у доступе да вакцын і адсутнасць упэўненасці ў іх мэтазгоднасці.

Сярод іншых глабальных пагроз чалавецтву СААЗ называе забруджванне паветра, новую пандэмію грыпу, з'яўленне новых устойлівых да антыбіётыкаў інфекцый, ліхаманку Дэнге, Эбола, ВІЧ, слабыя сістэмы медыцынскай дапамогі ў краінах, якія развіваюцца.

«Свет сутыкнецца яшчэ з адной пандэміяй грыпу — адзінае, чаго мы не ведаем, гэта калі яна здарыцца і наколькі сур'ёзнай будзе, — паведамляецца ў інфармацыйным лісце СААЗ. — Сусветная арганізацыя аховы здароўя пастаянна кантралюе цыркуляцыю вірусаў грыпу для выяўлення патэнцыйнага пандэмічнага штама: 153 установы ў 114 краінах удзельнічаюць у глабальным эпіднаглядзе. Кожны год СААЗ рэкамендуе, якія штамы варта ўключаць у вакцыну, каб абараніць людзей ад сезоннага грыпу. У выпадку, калі новы штам грыпу будзе мець пандэмічны патэнцыял, СААЗ стварыць унікальнае партнёрства для забеспячэння эфектыўнага і справядлівага доступу да дыягностыкі, вакцын і супрацьвірусных прэпаратаў, асабліва ў краінах, эканоміка якіх развіваецца».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## Энергію дасць сонца

**У Чэрыкаўскім раёне будуюць самую буйную ў СНД фотаэлектрастанцыю.**

Станцыя ўзводзіцца на тэрыторыі Рэчыцкага сельсавета на плошчы 220 га, яе магутнасць складзе 109 МВт. Ужо вядзецца мантаж канструкцый пад фотаэлектрычныя модулі. Пастаўку абсталявання і інжынірынг ажыццяўляе кітайская кампанія Power China Guizhou Engineering. Чакаецца, што агульная сума інвестыцый складзе больш за 150 мільёнаў долараў.

— Праект фінансуецца ірландскай кампаніяй «Камеліясайд Лімітэд», для рэалізацыі праекта інвестар стварыў на тэрыторыі раёна ТАА «Солар Лэнд», — паведаміла **намеснік старшыні Чэрыкаўскага райвыканкама Алена СЛЯПЦОВА.** — Інвестдагавор быў заключаны яшчэ ў 2014 годзе, але актыўнае будаўніцтва пачалося толькі летась. Увод аб'екта запланаваны на гэты год. Эканамічны эфект ад яго эксплуатацыі чакаецца вельмі добры. Для параўнання, уласнік фотаэлектрастанцыі на 4 МВт, якая ўжо працуе ў раёне, з'яўляецца другім па велічыні плацельшчыкам падаткаў.

Чэрыкаўскі раён наогул прывабны для інвестараў. Як паведамілі ў райвыканкаме, цяпер тут у рабоце знаходзіцца інвестпраект на суму больш за 10 мільёнаў рублёў беларуска-літоўскага ТАА «Натуральная вада» — на будаўніцтва прадпрыемства па разліве вады.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## Знайшлі 6100 долараў і падзялілі іх

**У Ленінскае РУУС сталіцы звярнулася жыхарка Мінскай вобласці, якая растлумачыла, што страціла ў будынку гандлёвага цэнтра па вуліцы Дзянісаўскай 6100 долараў ЗША. Грошы выпалі з сумкі, калі жанчына набывала гарнітуру для тэлефона. Прапажу выявіла, знаходзячыся на тэрыторыі гандлёвага цэнтра ў кавярні.**

Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку ў ходзе аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў былі ўстаноўлены асобы, якія знайшлі грошы. Імі былі дзве непаўналетнія мінчанкі, якія падзялілі валюту пароўну. Адна паспела частку сумы патраціць (купіла мабільны тэлефон, вопратку), у другой долары засталіся некранутымі.

Па гэтым факце праводзіцца праверка. Дзеянням непаўналетніх будзе дадзена прававая ацэнка. Канфіскаваныя ў іх грошы знаходзяцца ў Ленінскім РУУС сталіцы і ў найбліжэйшы час будуць вернуты ўладальніку.

## Назіраеце замор? Паведамляйце!

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя просіць паведамляць пра заморныя з'явы рыбы на вадаёмах.**

На сайце ўстановы агучана просьба інфармаваць аб выпадках масавага падыходу рыбы да лунак на вадаёмах і іншых прыкметах заморных з'яў. Інфармацыю пра гэта трэба адрасаваць у абласныя і Мінскі гарадскі камітэты прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, раённыя і гарадскія інспекцыі. Гэта дазволіць своечасова прымаць меры па папярэджванні замораў рыбы на вадаёмах.

Тэрытарыяльныя органы міністэрства фарміруюць, вядуць і штогод акумулююць базы даных з пераліках вадаёмаў, дзе могуць узнікаць заморныя з'явы. Сумесна з Рэспубліканскім цэнтрам аналітычнага кантролю ў галіне аховы навакольнага асяроддзя яны праводзяць абследаванні вадаёмаў, каб выявіць фактары, якія могуць прывесці да замораў. Такія абследаванні на працягу года ў перыяд з 1 студзеня да 1 красавіка і з 15 чэрвеня да 20 жніўня будуць праводзіцца не радзей, чым адзін раз у 15 дзён.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Камунальныя стасункі

# ЧЭК ЗА ШКЛЯНКУ І БЛЯШАНКУ

## будуць атрымліваць беларусы ў спецыяльных тараматах

**Прылады, якія ўсталююць у буйных гандлёвых цэнтрах краіны, будуць прымаць толькі нябітыя і нерастаптаныя алюмініевыя бляшанкі, ПЭТ-бутэлькі і шкляныя, дзе не пашкоджана этыкетка. Менавіта на ёй змесцяць штрых-код, па якім тарамат вызначыць, ці варта плаціць за гэты другасны рэсурс. Заклад за ўпакоўку, дарэчы, можна будзе атрымаць не толькі чэкам, але і перавесці грошы на мабільны ці дабрачынны рахунак.**

### Пашыраная адказнасць у дзевяць капеек

Плануецца, што дэпазітна-закладная сістэма (ДЗС) запрацуе ў 2020 годзе. Час конкурсу, які вызначыць, хто стане інвестарам, гатовым укласці 100 мільёнаў еўра ў некалькі тысяч тараматаў, каб наладзіць у краіне такі збор, пакуль не аб'яўлены. Аднак гэта мусіць быць арганізацыя з вопытам работы з дэпазітнай сістэмай, падкрэслівае **Анатоль ШАГУН, начальнік упраўлення ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»**:

— Сам падыход да арганізацыі ДЗС досыць просты. Але, каб схема добра працавала і мела мінімальныя інвестыцыйныя і эксплуатацыйныя затраты, інвестару прапануецца самому спраектаваць і стварыць сістэму. А маючы вопыт, ён уяўляе, як гэта павінна быць арганізавана. Тое, што сістэма будзе ўкараняцца, мы ўпэўнены, бо яна дазваляе ў разы павялічыць збор упакоўкі, якая сёння трапляе ў несартаваныя адходы і ў выніку — на палігоны, а не на перапрацоўку. Пры гэтым яна не павялічыць затраты вытворцаў і пастаўшчыкоў і як вынік — цану тавару на паліцы.

Сёння ва ўсе віды ўпакоўкі закладзены кошт будучых затрат на яе ўтылізацыю. Для шкляной паўлітровай бутэлькі, напрыклад, дзевяць капеек. І гэтая лічба, прынамсі пры ўвядзенні і спорнай рабоце дэпазітна-закладной сістэмы, можа нават зменшыцца да сямі, лічыць прадстаўнік Аператара:

— Пашыраная адказнасць вытворцаў упакоўкі ў практыцы абыходжання з цвёрдымі камунальнымі адходамі (тыя самыя дзевяць капеек) — толькі адна з крыніц фінансавання дэпазітнай сістэмы. Сюды ўваходзяць таксама сродкі ад продажу ўпакоўкі, сабранай у якасці другасных матэрыяльных рэсурсаў. А таксама невернутыя дэпазіты — грошы, якія былі заплачаны чалавекам за тару пры набыцці тавару з улікам закладу за ўпакоўку. Дасягнуць стапрацэнтнага збору ўпакоўкі на перапрацоўку, вядома, нерэальна. Як паказвае практыка, 10—20 % яе не вяртаецца. Нешта паб'ецца, парвецца, выкінецца на сметнік.

Да ўдзелу ў конкурсе мяркуецца прыцягнуць як прыватныя, так і дзяржаўныя арганізацыі, дадае **Алег ГРУЗІНАЎ, начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

— Мы хочам не дапусціць ніводнай памылкі, якая магла б стаць тормазам на шляху ўкаранення гэтай сістэмы. Разглядаем і магчымасць размяшчэння тараматаў у пэўных гандлёвых пунктах, і зручнасць, і неабходнасць абнаўлення сістэмы касавых апаратаў, каб яны прымалі чэкі з закладнымі сумамі, і сам кошт за ўпакоўку.

### Больш тары, больш... пакупак

Мяркуецца, што тараматы ўстановяць не толькі ў гандлёвых цэнтрах, але, магчыма, і па-за іх межамі, на паркоўках каля будынкаў гэтых крам, каб здаць тару можна было ў любы час.

Паколькі дэпазітна-закладная сістэма — рэч для дзяржавы карысная, рытэйлерам будзе выгадна ўключыцца ў гэтую схему і выдзеліць месца пад тараматы ў сваіх памяшканнях. Цэнтры павінны разумець сваю адказнасць у агульнай справе асобнага збору смецця. Думаючы аб прыбытку, нельга забывацца на сацыяльна-экалагічную адказнасць, кажа Алег Грузінаў:

— Людзі ўсё больш сартуюць тару. Калі ў Літве пачыналі такі праект, планавалі дасягнуць звароту ў 60—70 %, а па факце атрымалі ўсе 79 %, а наступным годам — ужо больш за 90 %. А беларусы і літоўцы вельмі падобныя і па менталітэце, і па суадносінах спажывецкага кошыка да сярэдняга заробку.

Акрамя таго, крамы, на тэрыторыі якіх паставяць абсталяванне, будуць атрымліваць невялікую плату, якая пакрые іх выдаткі на абслугоўванне тарамата: электраэнергію, сувязь з інтэрнэтам, выманне ўпакоўкі. Зацікаўленасць гандлёвага пункта ва ўсталяванні тараматаў яшчэ і ў павелічэнні колькасці спажыўцоў і гандлёвага абароту, лічыць Анатоль Шагун:

— Калі чалавек здасць тару ў краме і атрымае чэк, то імаверна, што рэалізуе яго тут жа. І гэта прамы стымул мець у сябе пункт прыёму тары.

Вернутую праз тараматы ўпакоўку могуць як аддаваць на перапрацоўку самім яе вытворцам, так і прадаваць адпаведным перапрацоўчым арганізацыям.

### Увайшоў цэлы, выйшаў — сплюшчаны

Прынцып дзеяння тарамата досыць просты. Чалавек апускае бляшанку шкляную ці пластыкавую бутэльку ў прыладу і атрымлівае чэк на 20 капеек за кожную ўпакоўку. На думку спецыялістаў, гэта дастатковы кошт, які прастымулюе чалавека не выкінуць тару ў смецце, а прынесці да тарамата. На ім, у адрозненне ад некаторых еўрапейскіх аналагаў, будзе толькі адна адтуліна для ўсёй упакоўкі.

— Сучасны ўзровень распазнавання розных відаў тары дазваляе прымаць усю ўпакоўку праз адну адтуліну. У тарамаце бутэлькі распазнаюцца па форме, вазе і штрых-кодзе на этыкетцы, — заўважыў прадстаўнік Аператара. — Гэтых параметраў дастаткова, каб выключыць магчымае махлярства з другаснымі рэсурсамі: спробу здаць бутэльку, якой няма ў ДЗС, усунуць у тарамат пакамечаную ці пабітую ўпакоўку з пашкоджанай этыкеткай, недапітую бутэльку.

Пра наяўнасць штрых-кода і ўключэнне тары ў закладную сістэму павінен клапаціцца сам вытворца ўпакоўкі. Калі тара будзе ўвозіцца з-за мяжы, пастаўшчык павінен сачыць, каб яе памеры і форма адпавядалі тым, што будуць акрэслены ўмовамі дэпазітна-закладной сістэмы. На паліцы крам не павінна трапляць бутэлька, якая не можа ўлезці ў тарамат, кажа Алег Грузінаў.

Спажывец зможа сам выбраць спосаб вяртання закладу з дапамогай пэўных кнопак на абсталяванні. Атрымаць чэк, перавесці сродкі на мабільны тэлефон, а то і ўвогуле даслаць іх на дабрачынны рахунак, разважае Анатоль Шагун:

— Калі чалавек выбірае чэк, яго можна будзе рэалізаваць у межах крам гандлёвай сеткі, дзе ўсталяваны тарамат, — прыкласці да пакупкі замест часткі сумы наяўных грошай або нават атрымаць за яго гатоўку на касе.

Мяркуецца, што за напаўненнем тараматаў можна будзе сачыць анлайн, каб своечасова апаражняць іх. Дарэчы, хоць прымаюцца ДМР толькі цэлымі, бляшанкі і ПЭТ-бутэлькі вымаюцца з тарамата спрасаванымі, а шкляныя бутэлькі (калі гэта не шматабаротная тара) — у выглядзе шклабою. Гэта яшчэ адна гарантыя супраць махлярства — каб тару не здалі паўторна.

Тараматы з'явяцца і пачнуць працаваць адначасова ва ўсіх буйных гарадах краіны. Вядома, што ў невялічкіх раённых крамах такія прылады не ўсталююць — прадавец тут будзе вяртаць заклад уручную. Шляхам устаноўкі тараматаў спадзяюцца стымуляваць насельніцтва да яшчэ большага збору ДМР і дасягнуць вяртання ў другаснае карыстанне 80 % усёй упакоўкі.

**Ірына СІДАРОК.**

# Ад вяленых таматаў да чырвонай рыбы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Мінскі харчовы банк планаваў супрацоўнічаць у асноўным з гандлёвымі сеткамі. Але аказалася, мэтавая аўдыторыя не толькі яны. Калі ў Еўропе крамы самі нясуць адказнасць за ўтылізацыю непрададзеных прадуктаў, то ў нас яны падпісваюць дагаворы з пастаўшчыкамі і вяртаюць ім усё, што заляжалася на прылаўках. Таму лепш рабіць стаўку менавіта на вытворцаў — так дзейнічае, напрыклад, расійскі харчовы банк.

Пакуль праект працуе толькі з адной гандлёвай сеткай. Плюс далучыўся харчовы холдынг: у хуткім часе ён павінен перадаць вялікую і разнастайную партыю прадуктаў. Яшчэ з трыма гандлёвымі сеткамі ёсць дамоўленасць аб перагаворах.

Варта таксама наладзіць кантакты са сховішчамі агародніны і фруктаў.

— З намі звязвалася адно, яно дастаткова буйное, знаходзіцца пад Полацкам. У іх утвараецца каля 40 тон адходаў у месяц. Яны самі звянілі ў Цэнтр экалагічных рашэнняў з просьбай дапамагчы. Відавочна, што хоць бы 10 працэнтаў з тых фруктаў і агародніны, што выкідаюцца, можна выратаваць.



Алена заўважае: кожная крама сама для сябе вызначае паняцце нормы. Адны выкідаюць бананы з некалькімі чорнымі плямамі, а іншыя прадаюць напалову гнілыя на зніжках. Трэба знайсці тых, у каго завышаныя стандарты якасці, і пераразмяркоўваць ежу, якая ў іх застаецца.

Што аддаюць крамы? Напрыклад, прадукты, якія ім пастаўляюцца як узоры і потым не прадаюцца. Асартымент розны — ад вяленых таматаў да чырвонай рыбы.

Сем'і, якія маюць патрэбу, знаходзяць праз дабрачынны праект KaliLaska. Сярод іх — пенсіянеры, людзі з інваліднасцю, шматдзетныя сем'і.

— Мы супрацоўнічалі таксама з тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна. Атрымалася нядрэнна: цэнтр павесіў аб'яву ў сябе на паверсе, і ў дзень раздачы ежы прыйшло чалавек 17. За 15 хвілін мы размеркавалі паміж імі практычна ўвесь багажнік прадуктаў, — дзеліцца Алена.

І называе яшчэ адзін важны момант, чаму харчовы банк актуальны.

— У нас ёсць нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2020 года. Там якраз ідзе размова і пра тое, што трэба пераразмяркоўваць рэсурсы, каб скарачаць колькасць адходаў. Таму наш праект адпавядае парадку дня. Можа, гэта падштурхне да змен у заканне. Напрыклад, у Францыі крамам забаронена выкідаць прадукты: іх трэба або перапрацоўваць на біягазавых устаноўках, або аддаваць тым, хто мае патрэбу.

У асноўнай камандзе праекта ўсяго тры чалавекі. Харчовы банк яны ствараюць на добраахвотных пачатках. У кожнай з дзяўчат ёсць асноўная работа: Алена працуе менеджарам праекта ў Асацыяцыі дадатковай адукацыі і асветы, Эліна Сапожнікава — галоўным рэдактарам дзіцячага часопіса, Наталля Блышчык — спецыялістам па адходах і хімічнай бяспецы Цэнтра экалагічных рашэнняў.

— Нам ужо пісалі з Гродна, Магілёва, што хацелі б там такі ж праект запусціць. Мы дамовіліся, што, калі будзе наладжана сістэма, зможам правесці навучанне ў іншых рэгіёнах, — кажа Алена. — Спачатку ты будзеш рабіць гэта бясплатна. Але гэта вельмі цікава — будаваць новую сістэму. У Еўропе стварэнне харчовых банкаў у сярэднім займала па дзесяць гадоў. Там таксама ўсё пачыналася з пары чалавек, якія на сваёй машыне заязджалі ў булачную, забіралі хлеб, які там не распрадалі, і адвозілі ў сацыяльную сталовую. Думаю, мы будзем расці хутчэй: грамадства цяпер больш гатовае да такіх змен.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# ДЗІЦЯЧАЕ РАСТВАРАЛЬНАЕ ПЕЧЫВА АД «СЛОДЫЧА»

**«Кандытарская фабрыка «Слодыч» пачала вытворчасць дзіцячага растваральнага печыва «Любачка» для харчавання дзяцей ранняга ўзросту ад шасці месяцаў. Зараз лінейка складаецца з двух смакаў: класічнага і яблык+гарбуз, паведамілі ў канцэрне «Белдзяржхарчпрам».**

Рэцэптура печыва распрацавана тэхнолагамі ААТ, раней такое для дзяцей ранняга ўзросту ў Беларусі не выпускалася і бацькам малечы даводзілася набываць толькі імпартнае.

Печыва вырабляецца на сметанковым масле, не ўтрымлівае фарбавальнікаў і кансервантаў, у яго склад уваходзіць пшанічная мука вышэйшага гатунку, сухое абястлушчанае і цэльнае згушчанае малако, цукар, гарбузовае і яблычнае пюрэ.

Для дзяцей, якім больш за шэсць месяцаў, рэкамендуецца распусціць дзве-тры пячэнькі ў 100 міліграмах вадкасці, якую ўжывае дзіця ў адпаведнасці з яго ўзростам (груднае малако, дзіцячая сумесь, сок, вада і г. д.). Для дзяцей старэйшых за 12 месяцаў пячэнне можна выкарыстоўваць у якасці дапаўнення да асноўнай ежы без папярэдняга распускання. Колькасць растваральнага печыва на адно кармленне і індывідуальную схему кармлення дзіцяці ім дапаможа вызначыць урач-педыятр.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

24 СТУДЗЕНЯ 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 2 (15857)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года




Імёны

## Дзіяна ГРОМАВА:
# «Мае слухачы растуць разам са мной»

**Упершыню дзяўчына выйшла на сцэну ў пяцігадовым узросце. Калі ёй было пятнаццаць, скарыла Галівуд, дзе на Сусветным чэмпіянаце выканаўчых мастацтваў заваявала два залатыя і бронзавы медалі. А ў 2016 годзе яе песня «Разбіваемся» стала адной з самых рацыраваных на беларускіх радыёстанцыях. Знаёмцеся — Дзіяна ГРОМАВА!**

***— Многія памятаюць цябе маленькай «зорачкай», якая штурмавала нацыянальныя адборы на дзіцячае «Еўрабачанне», перамагла ў «Сузор'і надзей»...***

— З таго часу я вельмі змянілася. На жаль, далёка не ўсе гэта разумеюць і працягваюць успрымаць мяне як «дзяўчынку з хвосцікамі». Калі ты дарослы артыст, гэта часам замінае. Дыпломы, узнагароды, здабытыя ў дзяцінстве, не характарызуюць мяне як цяперашнюю спявачку. Не люблю, калі перад выхадам на сцэну пачынаюць іх пералічваць. Дарэчы, таму многія «зорныя дзеці» і выбіраюць непублічныя прафесіі.

З іншага боку, шматлікія конкурсы, праекты, канцэрты, якія мелі месца ў дзяцінстве, загартавалі мяне. Дзякуючы ім я зразумела, што сцэна — дакладна маё. Гэты досвед неацэнны. За кулісамі нацыянальнага адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» я ўпершыню ўбачыла кухню шоу-бізнесу знутры. На Сусветным чэмпіянаце выканаўчых мастацтваў працавала побач з неймаверна таленавітым і працаздольным Пятром Ялфімавым.

***— Няма жадання прыняць удзел у музычных конкурсах для дарослых выканаўцаў?***

— Цяпер музычная індустрыя працуе па іншых законах. Можна ўвогуле нідзе не выступаць, а проста закінуць сваю песню ў сацыяльныя сеткі і назаўтра прачнуцца знакамітым і запатрабаваным. Дзясяткі папулярных маладых артыстаў так і зрабілі. Але для астатніх соцень тысяч гэты варыянт не спрацаваў. Не бачу нічога дрэннага ў тым, калі прафесіяналы ўдзельнічаюць у праектах накшталт «Голасу» ці «Х-фактару». Такім чынам яны атрымліваюць магчымасць засвяціцца на тэлеканалах.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Свой выбар

# ЁСЦЬ КАНТАКТ!

## Як дзяўчына-электрамеханік забяспечвае рух цягнікоў

**На чыгунку дзяўчаты часцей уладкоўваюцца правадніцамі, касірамі ці дыспетчарамі. Але ёсць спадарыні і ў «нежаночых» прафесіях. Так, сярод электрамеханікаў Мінскай дыстанцыі электразабеспячэння шчыруе брунетка Маргарыта БАГЛАЙ. На падстанцыі Памыслішча яна працуе чацвёрты год і адказвае за тое, каб цягнікі хадзілі без збояў.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Падстанцыя забяспечвае энергіяй кантактную сетку чыгункі і прыватны сектар найбліжэйшай вёскі. Для гэтага тут стаіць шмат абсталявання. Кожная з жалезных «шаф» — блокаў мікрапрацэсарнай рэлейнай засцярогі — адказвае за пэўны ўчастак чыгункі. Задача электрамеханіка — кантраляваць работу прыбораў і рамантаваць іх пры неабходнасці. Штосьці Маргарыта рамантуе сама, штосьці прыязджае наладзіць брыгада.

Безліч выключальнікаў, таблічкі, абрэвіятуры...

— Першыя два месяцы я таксама не разумела, што да чаго, — смяецца дзяўчына. — Але мне дапамагалі з усім разабрацца, рыхтавалі да дзяжурстваў, каб можна было пакінуць адну.

Як прыгажуню занесла ў гэту прафесію?

— Калі мне было гадоў восем, мая мама працавала на дыстанцыі электразабеспячэння. Я часам заходзіла да яе на работу і аднойчы сказала: калі вырасту, таксама сюды ўладкуюся, — прыгадвае Маргарыта.

З чыгункай былі звязаны таксама яе бабуля і дзядуля. Дый бацька нейкі час працаваў на вагонным участку. Таму пасля дзявятага класа дзяўчына збіралася паступаць у чыгуначны каледж. Але там дакументы не прынялі, бо Маргарыце яшчэ не было 16 гадоў. Тады яна выбрала пайсці ў энергетычны каледж. «Вы ўпэўнены, што вам будзе цікава вывучаць катлы і трубы?» — толькі і спыталі ў яе члены прыёмнай камісіі.

— З вучобай я ў цэлым нядрэнна спраўлялася. Аказалася, што была, бадай, адзінай са сваёй групы, хто не пашкадаваў, што туды паступіў, — дзеліцца суразмоўніца.

Большасць хлопцаў, што вучыліся з ёй, размеркавалі на цеплаэлектрастанцыю. Дзяўчатам выдавалі свабодныя дыпломы. Некаторыя з іх пайшлі ў энергазбыт, займацца дакументацыяй. Маргарыту ж вабіла чыгунка. Быць праваднiцай яна не хацела («раз'езды не для мяне — я дамашні чалавек»), таму ўладкавалася электраманцёрам на дыстанцыю электразабеспячэння. А з часам стала электрамеханікам.

***(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)***

Субкультура

# «ЛАЙКІ» ЗА «ЛУКІ»,

## ці Дзеля чаго шукаюць папулярнасць у «Інстаграме»

**На сёлета колькасць зарэгістраваных карыстальнікаў «Інстаграма» складае 1,1 мільярда чалавек. Размяшчэнне фотаздымкаў на прасторах папулярнай сацсеткі стала для маладых людзей новым хобі. А для некаторых — нядрэнным заробкам. Пагоня за праглядамі, «лайкамі», каментарыямі... Ці варта гэта намаганняў і часу? З такім пытаннем мы звярнуліся да студэнтаў, чыя колькасць падпісчыкаў у «Інстаграме» склала ад тысячы і больш.**

**Карына ДЗЯНІСАВА, студэнтка IV курса філалагічнага факультэта БДУ:**



— У «Інстаграме» зарэгістравалася ў старшых класах. Тады ён быў не такі папулярны, і я не надавала яму значэння як сацыяльнай сетцы. Пасля заканчэння школы з'явілася больш часу, таму актыўна стала весці свой профіль, натхняючыся вопытам іншых дзяўчат. Спачатку папулярнасцю карысталіся мае сэлфі, але потым зразумела, што гэта занадта самаўлюбёна. Разбавіла гэтую аднатыпнасць фатаграфіямі ў поўны рост, моднымі «лукамі», здымкамі на фоне прыгожых будынкаў. Асабліва мяне цешылі станоўчыя каментарыі, тады хацелася дзяліцца новымі фота яшчэ і яшчэ.

Для мяне «Інстаграм» як асабісты дзённік. Нават завяла такое правіла: калі іду на чыйсьці дзень нараджэння, абавязкова выкладваю фатаграфію. Прычым захоўваю храналогію, каб атрымлівалася лагічная карцінка майго жыцця. Напрыклад, узімку не выкарыстоўваю летнія здымкі. Думаю, праз гадоў дваццаць мне будзе прыемна пераглядаць сваю старонку і ўспамінаць маладосць. Я рэдка падпісваю фатаграфіі. Баюся, што падзялюся думкамі, а гэта нікому не будзе цікава.

Звычайна іду па горадзе, ацэньваю якое-небудзь месца і раблю выснову: вось тут атрымаецца прыгожае фота, яно збярэ шмат «лайкаў». Часцей за ўсё мяне здымае мой малады чалавек. Раней бурчаў. Але цяпер зразумеў, як зрабіць добры кадр. Нават раіць мне, як і дзе лепш стаць.

Калі ў цябе шмат падпісчыкаў, людзі думаюць, што ты цікавая асоба. На самай справе ўсё можа быць інакш. Але зараз меркаванне пра чалавека складаецца дзякуючы сацыяльным сеткам. Да папулярных інстаграм-блогераў я стаўлюся з павагай і нават трохі ім зайздрошчу. Завяваць увагу аўдыторыі не так проста. Каб прыцягнуць рэкламадаўцаў і мець прыбытак ад свайго профілю, трэба распрацоўваць яго канцэпцыю, стыль. У мяне няма на гэта часу. На першым месцы — вучоба, кар'ера, блізкія людзі.

***(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
24 01 2019 г.

Інавацыі ў адукацыі

# НАВОШТА ВАМ ГРОШЫ, КАЛІ Ў ВАС НЯМА МАРЫ?

## Як уменне ўвасабляць ідэі ў дзеянні можа падрыхтаваць да дарослага жыцця

**Кот Матроскін з дзіцячага мультфільма (прыклад эканомнага і ашчаднага гаспадара) — персанаж, які палюбіўся многім. Ну хто не памятае легендарных фраз гэтага героя: «Я са сваёй Муркай ні за што не расстануся. Я і так быў шчаслівы, а цяпер удвая шчаслівейшым стану, таму што ў мяне цяпер дзве каровы ёсць», «Шарык, па квітанцыі карова рудая адна... Бралі мы яе адну па квітанцыі. Значыць, і здаваць будзем адну, каб не парушаць справаздачнасці», «А я нічога не буду. Я эканоміць буду». Можна прыгадаць яшчэ аднаго мульцяшнага героя Скруджа МакДака, які пастаянна выкладаў азы бізнесу сваім пляменнікам. Цікава, а наколькі рэальна выхаваць будучага бізнесмена яшчэ за школьнай партай? Аўтары праекта «Развіццё прадпрымальнасці як адной з ключавых кампетэнцый на этапе дапрофільнай падрыхтоўкі» ўпэўнены, што закласці адпаведны падмурак цалкам магчыма. У рамках рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, што прайшла ў сценах Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі (МГІРА), абмяркавалі інавацыйныя падыходы па фарміраванні прадпрымальніцкіх кампетэнцый у маладзёжным асяроддзі.**



### Зламаць шаблоны

— Сучаснае грамадства дыктуе свае правілы: сёння найбольш канкурэнтаздольны і паспяховы той, хто валодае прадпрымальнасцю і высокімі камунікатыўнымі навыкамі, — дзеліцца сваімі думкамі **адзін з аўтараў праекта, начальнік упраўлення каардынацыі стажыровак і міжнароднага супрацоўніцтва МГІРА Тэрэса МЯТЛІЦКАЯ.** — Школа павінна выхоўваць у вучняў такія якасці, як уменне быць мабільным у эканамічным асяроддзі, гатоўнасць да рызыкі, змены прафесіі, прадпрымальнасць. Карысная актыўнасць навучэнца — галоўны крытэрый ацэнкі яго паспяховасці. Працэс фарміравання эканамічнай адукаванасці і прадпрымальнасці будзе праходзіць больш поўна, калі знойдзе сваё адлюстраванне ў агульнаадукацыйным працэсе. А бессістэмны, эпізадычны, кропкавы характар атрымання эканамічных ведаў карысці не прынясе. Наш праект можна разглядаць як інавацыю, выкліканую патрэбамі рынку. Яго мэта — развіццё прадпрымальнасці ў навучэнцаў і педагагічных работнікаў сталічных устаноў адукацыі. Дарэчы, навуковым кансультантам праекта выступіў старшыня Прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзімір Карагін.

**Трэба мець смеласць для таго, каб думаць па-новаму.**

— Прадпрымальніцтва і адукацыйны працэс: да апошняга часу гэтыя паняцці падаваліся ўзаемавыключальнымі, — разважае **навуковы кіраўнік праекта, доктар педагагічных навук, прафесар кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі Віктар НАВУМЧЫК.** — З часоў Яна Каменскага школа працуе як гадзіннік, у ёй усё прадказана і прадвызначана на гады наперад. І калі сказана адступіць дзве клетачкі, гэта значыць, што толькі дзве. А ў рэчаіснасці жыццё напоўнена сітуацыямі нявызначанасці, якія прадугледжваюць самастойны адказны выбар. Прадпрымальнасць выходзіць за межы дзвюх клетачак. Яна разбурае стэрэатыпы... «Прадпрымальніцтва ёсць стваральнае разбурэнне», — казаў вядомы эканаміст, палітолаг, сацыёлаг і гісторык эканамічнай думкі Іозеф Шумпетэр. Інавацыі — крыніца прагрэсу — заўсёды прыводзяць да адмірання старога. Таму, калі мы ўносім у нашы школы дух прадпрымальніцтва, мы ўносім туды стваральнае разбурэнне.

**80 % педагогаў перакананыя ў неабходнасці навучання дзяцей і падлеткаў асновам прадпрымальніцтва.**

«Прадпрымальніцтва — гэта пошук магчымасцяў за межамі рэсурсаў, што маюцца на сённяшні дзень», — казаў заслужаны прафесар Гарвардскага ўніверсітэта, «леў» Гарвардскай бізнес-школы Говард Стывенсан. І з яго думкай цяжка не пагадзіцца. Наша школа навучае ўсяму, толькі не вучыць вучыцца. Дзеці не любяць вучыцца, і супрацьстаянне «вучань — настаўнік» трансфармуецца ў ВНУ у супрацьстаянне «выкладчык — студэнт». Маладыя людзі, якія маюць падпрацоўку, аддаюць перавагу заробленым грошам, а не наведванню лекцый. Яны ведаюць, што сталі ў чаргу па дыплом. **Але ці стануць яны разбуральнікамі стэрэатыпаў? Думаю, што ніколі... Будуць звычайнымі чыноўнікамі ці офісным планктонам і будуць скардзіцца на жыццё, маўляў, заробак іх не задавальняе.** А ці навучыліся вы працаваць над сабой? Ці навучыліся думаць так, як думаюць прадпрымальнікі? Ці шукалі вы сваю нішу? Прычым гэта ніша павінна быць карыснай не толькі для цябе аднаго, а сацыяльна карыснай... Зараз мы спрабуем укараніць у школу азы эканомікі, але ці добра гэта? Прафесіянал ведае, а дылетант — шукае і сам стварае... Калі ў Эйнштэйна пацікавіліся, як ён адкрыў сваю тэорыю адноснасці, той шчыра адказаў, што проста не ведаў, што гэта немагчыма...

На думку Віктара Навумчыка, дзеці — найлепшыя дылетанты, таму што, не маючы патрэбных ведаў, яны нярэдка робяць адкрыцці, якія здзіўляюць прафесіяналаў. Не ўсе ведаюць, што важныя адкрыцці ў многіх навуках робяць не толькі прафесіяналы, але і дылетанты.

— Памылкі робяць усе. А вось уменне і выпраўляць свае памылкі — якасць, уласцівая прадпрымальнікам, — падкрэслівае прафесар. — Жыццё вакол нас шматбаковае і непрадказальнае, а школа хоча ўсё раскласці па палічках, усё растлумачыць. Мы ўвогуле ўваходзім у свет татальнай непрадказальнасці, дзе будуць запатрабаваныя такія прафесійныя прадпрымальніцкія якасці, як уменне лавіраваць, прычым не проста лавіраваць, а выжываць і цягнуць за сабой усю цывілізацыю, выводзіць яе на новы ўзровень. Калі ёсць мара, ёсць і рух наперад. Навошта вам грошы, калі ў вас няма мары?

Увогуле прадпрымальніцтва не з'яўляецца прафесіяй, яно можа праявіцца ў рамках любой з іх. Занятак навукай — гэта інтэлектуальнае прадпрымальніцтва: яму ўласцівыя інтэлектуальная бясстрашнасць, інфармацыйная адукаванасць, якая праяўляецца ў здольнасці хутка знаходзіць і апрацоўваць інфармацыю, цярплівасць да інфармацыйнага лішку і матывацыя да вытворчасці новых ведаў. Любы навуковец ёсць прадпрымальнік, паколькі ён шукае інтэлектуальныя рашэнні, якія выходзяць за рамкі ўяўленняў, нормаў і правілаў, што склаліся ў грамадстве.

### Ведаеш сам — падзяліся!

— Няма ніякіх сумненняў, што падтрымка вучнёўскіх бізнес-кампаній — найлепшы спосаб выхаваць пакаленне, якое будзе валодаць ключавымі сацыяльна-эканамічнымі кампетэнцыямі і псіхалагічнай гатоўнасцю для пошуку свайго месца на рынку працы. Але практыка паказвае, што работа над бізнес-праектам патрабуе не толькі сацыяльнай ініцыятывы, але таксама і прафесійных ведаў для распрацоўкі праекта. На жаль, існуе мала літаратуры, якая дапамагла б педагагічным калектывам і ўдзельнікам вучнёўскіх бізнес-кампаній правільна распрацаваць праект, — канстатуе **дацэнт кафедры эканамічнай сацыялогіі Інстытута сацыяльна-гуманітарнай адукацыі БДЭУ, кандыдат сацыялагічных навук Галіна БЯДУЛІНА.** — У БДЭУ пры падтрымцы кансалтынгавай установы «Сацыяльныя тэхналогіі бізнесу» быў створаны дапаможнік «Студэнцкае бізнес-цьютарства для развіцця прадпрымальнасці і навучання школьнікаў асновам прадпрымальніцтва». Ён разлічаны на выкладчыкаў і студэнтаў эканамічных ВНУ, якія падтрымліваюць удзельнікаў вучнёўскіх бізнес-кампаній, і не толькі на іх. У рамках міжнароднага праекта **ў БДЭУ быў створаны валанцёрскі клуб студэнтаў-настаўнікаў «Бізнес-цьютар»**. Цьютары — гэта студэнты старшых курсаў, якія выязджаюць у розныя рэгіёны, каб падзяліцца сваімі ведамі... Але і для іх гэта таксама ўнікальны досвед развіцця як прафесійных кампетэнцый, так і міжасабовага ўзаемадзеяння.

**«Прадпрымальнасць выходзіць за межы дзвюх клетачак. Яна разбурае стэрэатыпы...»**

Восенню мінулага года адбыўся злёт маладых сацыяльных наватараў «Праектны марафон», падчас якога прайшоў конкурс стартапаў школьных бізнес-кампаній. Дарэчы, заўважана, што найбольш паспяхова працуюць вучнёўскія бізнес-кампаніі, размешчаныя ў сельскай мясцовасці...

Цікава, што ў большасці педагогаў прадпрымальніцтва асацыюецца з ідэяй, уласнай справай (70 %) і прыбыткам, грашыма (55 %). Апытаныя ўпэўненыя, што прадпрымальнасць можна развіць, але павінны быць задаткі (80 %), і толькі некаторыя лічаць яе прыроджанай якасцю (10 %). Столькі ж рэспандэнтаў аптымістычна сцвярджаюць, што, узброіўшыся патрэбнымі ведамі, можна развіць прадпрымальнасць у кожнага чалавека. Пры гэтым **80 % педагогаў перакананыя ў неабходнасці навучання дзяцей і падлеткаў асновам прадпрымальніцтва.**

Псіхалагічны партрэт прадпрымальніка ўжо даўно з'яўляецца адной з самых папулярных тэм. Часта ўчынкі не па шаблоне дазваляюць атрымаць канкурэнтную перавагу. Некаторыя вялікія прадпрымальнікі, якія пакінулі свой след у гісторыі, вызначылі сваю ідэю інтуітыўна. Яны змаглі прадбачыць, што менавіта патрабуецца людзям сёння ці што спатрэбіцца ім у найбліжэйшай будучыні.

Трэба мець смеласць для таго, каб думаць па-новаму, а таксама мужнасць, каб быць гатовым да выклікаў і ўмець да іх адаптавацца.

**Уменне пераўтвараць ідэі ў дзеянні — ключавая кампетэнцыя прадпрымальнасці.** Канцэнтрацыя ўвагі на вырашэнні праблемы, а не на пошуку віноўнікаў таксама з'яўляецца немалаважнай якасцю добрага прадпрымальніка. Да характарыстык, якія дапамагаюць дасягнуць поспеху, псіхолагі адносяць лідарства, гатоўнасць рызыкаваць, уменне камунікаваць, схільнасць дамаўляцца, упэўненасць у сабе, энтузіязм, практычнасць, крэатыўнасць, авантурызм, гатоўнасць дзейнічаць ва ўмовах нявызначанасці, мэтанакіраванасць, аналітычны склад розуму, здаровы недавер, здольнасць да стратэгічнага планавання, імкненне да саманавучання і іншыя.

### Стварыць сваю справу

Праект па развіцці ў навучэнцаў прадпрымальнасці, які стартаваў летась, разлічаны да 2020 года. У Мінскім гарадскім інстытуце развіцця адукацыі ўжо распрацаваны праект праграмы факультатыўных заняткаў па фарміраванні ў школьнікаў асноў дзелавой культуры — для вучняў з першага па адзінаццаты класы: для пачатковай школы — больш азнаямленчы вучэбны матэрыял, а для старэйшых — з глыбокім практычным аспектам.

— У выніку вывучэння дысцыпліны школьнікі атрымаюць практычныя навыкі па адкрыцці ўласнай справы, рашэнні задач у бягучай прадпрымальніцкай дзейнасці, пошуку новых ідэй і рэсурсаў для развіцця бізнесу, — тлумачыць аўтар праграмы Тэрэса Мятліцкая. — Факультатыўны курс разлічаны на 36 гадзін у 1—9 класах і на 72 гадзіны — у 10—11 класах і скіраваны на фарміраванне ў навучэнцаў прадпрымальніцкай кампетэнтнасці — пад гэтым словазлучэннем разумеюць мадэль паводзін, якая дапамагае паспяхова вырашаць пэўную бізнес-задачу і пры гэтым дасягаць значных вынікаў.

Плануецца ў рамках праекта стварыць ва ўстановах адукацыі клубы юных прадпрымальнікаў і арганізаваць іх сеткавае ўзаемадзеянне з Беларускай канфедэрацыяй прадпрымальнікаў. Адна з устаноў адукацыі — удзельнікаў праекта, якая валодае сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай і інтэлектуальнай базай, назапашаным вопытам у рамках праектнай дзейнасці, стане гарадскім рэсурсным цэнтрам па фарміраванні прадпрымальнасці і арыентацыі выпускнікоў на развіццё згаданай кампетэнцыі. Будуць распрацоўвацца і праводзіцца дзелавыя гульні, сацыяльныя практыкі, прафесійныя пробы, розная ўзроўню чэмпіянаты па гульні «Бізнесбол».

Прадпрымальнасць — не перадумова для фарміравання арміі прадпрымальнікаў. Але **вывучэнне прадпрымальніцтва ў школе — выдатная прафарыентацыя**, паколькі гэты вопыт можа стаць стартавай пляцоўкай для далейшага прафесійнага развіцця яе выпускніка...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Усё — у тваіх руках!*

# ЛІДАРСТВА — ГЭТА АДКАЗНАСЦЬ

**Да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі майстар-класа «Майстэрства лідара» — вучні дзясятых-адзінаццатых класаў з розных куткоў Беларусі. Ён стаў эфектным заяршэннем серыі інтэрактыўных варкшопаў, што праводзіліся ў рамках сацыяльна-адукацыйнага праекта velcom YOUTH.**

Яго зладзіла кампанія velcom пры падтрымцы Міністэрства адукацыі і арганізатараў канферэнцыі TEDxMinsk. «Фішкай» праекта было абавязковае выкарыстанне беларускай мовы — ад падачы заявак і саміх выступленняў да фіналу... На папярэдніх лекцыях «Майстэрства прэзентацыі» і «Майстэрства выступлення» старшакласнікі вучыліся найлепшым чынам падаваць свае ідэі, а пасля — рабілі першыя крокі ў іх рэалізацыі. Усяго ў праекце зарэгістравалася больш за 800 самых актыўных школьнікаў, гімназістаў і ліцэістаў з 236 навучальных устаноў краіны. У трох майстар-класах паўдзельнічала больш за 700 вучняў-мінчан, а яшчэ больш за тры тысячы навучэнцаў з усёй Беларусі пагледзелі прамыя трансляцыі праз відэасэрвіс VOKA. Цяпер на гэтай платформе з запісамі майстар-класаў можа бясплатна пазнаёміцца кожны ахвотны.

...Напачатку ўвагу школьнікаў прыцягнуў відэазварот інжынера сацыяльнай сеткі «Фэйсбук» Ігара Маханька, які працуе ў Нью-Ёрку.

— Самая галоўная якасць лідара — ініцыятыва, — сказаў ён. — Выдатны метад для таго, каб трэніраваць і развіваць ініцыятыву і лідарства, — хобі. Маім недзе з дзясятага класа была інтэлектуальная гульня «Што? Дзе? Калі?». Спачатку трапіў у існуючую каманду, а потым стварыў сваю.

На думку Ігара Маханька, для лідара важна не баяцца цяжкасцяў. «Калі мы глядзім на паспяховых людзей, бачым толькі тое, што ў іх атрымалася, — адзначыў Ігар Маханёк. — Але ўспомніце Томаса Эдысана. У яго былі тысячы варыянтаў лямпачак, пакуль не атрымалася тая апошняя, што прынесла яму вядомасць. А ў баскетбаліста Ліброна Джэймса тысячы кідкоў мяча не трапілі ў кошык перш, чым да яго прыйшоў поспех...

Ад матывацыйнага відэазвароту ўдзельнікі майстар-класа перайшлі да пытання: як ажыццявіць ідэю? У гэтым дапамог разабрацца кіраўнік аргкамітэта конкурсу сацыяльных праектаў Social Weekend Аляксандр Скрабоўскі. Ён вызначыў чатыры неабходныя пункты, без якіх нельга стварыць праект. Па-першае, трэба мець сваё бачанне — прыгожую карцінку ў галаве. Па-другое — верыць у сваю ідэю. Далей — верыць у сябе. «Вам будуць казаць: «гэта ў цябе не атрымаецца, не сёння, не ў гэтай зале...» — сказаў выступоўца. — Але верце ў сябе, і ўсё спраўдзіцца». Апошняе — дзейнічаць. Падаць, але ўставаць і рабіць.

— Задайце сабе пытанне, — працягнуў Аляксандр Скрабоўскі. — «Навошта мне ідэя?» Атрымаць айфон, здарова патусіць тут? Ці таму, што гэта вам сапраўды важна. Першыя пару тыдняў вы працягнеце на голым энтузіязме. Драйву будзе шмат. Наступныя пару месяцаў давядзецца несаладка: давядзецца прымушаць сябе чымсьці займацца. Але менавіта пасля гэтага ў вас пачне атрымлівацца. Будзе крыўдна кінуць ідэю таму, што, аказваецца, яна вам не патрэбная і не цікавая. А вы ўжо шмат зрабілі, шмат людзей прывабілі, рэсурсы... З аднаго боку, вы маеце права. А з другога — гэта няправільна. Калі вы кагосьці пацягнулі за сабой, то несяце адказнасць за гэтага чалавека. За тое, чый час вы скралі. Лідар — гэта ў першую чаргу адказнасць.

Каб наглядна паказаць старшакласнікам, што іх ідэі сапраўды магчыма ажыццявіць, на сцэну запрасілі такіх жа школьнікаў, як і яны: Сцяпана Навасельскага і Антона Кастэнку — фіналістаў конкурсу Social Weekend 2018.

Мы вырашылі арганізоўваць сумесныя трэніроўкі, — расказалі хлопцы. — Дамаўляемся са спецыялістамі і спартыўнымі арганізацыямі, а яны праводзяць уводныя заняткі, дзе знаёмяць з відам спорту. Некаторыя падлеткі пасля працягваюць ім займацца. Таксама арганізуем спартыўныя квэсты на вуліцы, у парку: дзелім удзельнікаў на каманды і прапаноўваем ім эстафеты, конкурсы, іншыя выпрабаванні. Так яны вучацца працаваць у камандзе.

Трэцім выступоўцам быў ужо вядомы ўсім па папярэдніх майстар-класах вядучы «Радыё Бі-Эй» Дзмітрый Смірноў. Ён таксама згадаў адказнасць, але адзначыў, што ў першую чаргу яна павінна быць за сябе. Кожны сам павінен прымаць сваю віну, не наракаючы на начальніка ці падначаленых.

Дзмітрый прапанаваў школьнікам вызначыць, хто з'яўляецца лідарам, Віктар Цой ці Ягор Крыд? І яны беспамылкова адказалі: «Канешне ж, Цой!» Чаму? Таму што ў яго была ідэя, якую можна сфармуляваць па-рознаму: «голас свабоды», «голас перамен, якія адбываліся ў грамадстве», «голас пакалення». Творчасць жа Крыда не сфарміраваная ў адну зразумелую думку — вызначылі вучні і выступоўца.

Таксама школьнікі выконвалі розныя заданні ад выступоўцы. Станавіліся ў круг, размяркоўваліся па росце, разбіваліся на дзве каманды (хлопчыкаў і дзяўчатак) і на хуткасць выкрыквалі любую фразу з пяці слоў. Мэтай заданняў было паказаць, што ў кожнай камандзе вызначаліся тыя, хто вёў, — лідары, і тыя, хто падпарадкоўваўся. Выснова зразумелая: каб быць лідарам, трэба не чакаць, не стаяць на месцы, а дзейнічаць.

...Удзельнікі праекта пачалі ўжо рэалізоўваць свае ідэі ў трох кірунках: тэхналогіі, культура і інклюзія. Да канца лютага ім трэба будзе стварыць і змясціць на сваіх старонках у сацыяльных сетках відэаролік-прэзентацыю з хэштэгам #velcomYOUTH. Яго і будзе ацэньваць журы. Галоўнымі крытэрыямі стануць арыгінальнасць і нестандартнасць вырашэння праблемы, маштаб, ступень практычнай рэалізацыі ідэі, дэманстрацыя навыкаў, атрыманых падчас адукацыйных майстар-класаў, і дакладнае адлюстраванне сутнасці праекта ў відэаролiку.

Дзесяць найлепшых аўтараў атрымаюць айфоны апошняй мадэлі. Але, галоўнае, наведаюць сустрэчу TEDxMinsk у сакавіку і пачнуць працаваць над прэзентацыяй сваёй ідэі з ментарамі — спецыялістамі ў сваёй галіне. Выступленні фіналістаў адбудуцца на выніковым мерапрыемстве TEDxYouth@Minsk у маі. Трох пераможцаў (па адным у кожным кірунку конкурсу) запросяць на мерапрыемства TEDx у Аўстрыю.

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*У гонар Перамогі*

# ВАХТА ПАМЯЦІ ЗОРНАГА ПАХОДУ

**З 28 студзеня па 1 лютага Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка праводзіць 54-ы інтэрнацыянальны Зорны паход па месцах баявой і працоўнай славы беларускага народа.**



Ён праходзіць штогод з 1966 года і сёлета прысвечаны 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Дзевяць атрадаў агульнай колькасцю больш за 300 чалавек наведаюць раёны Мінскай, Віцебскай, Гродзенскай і Магілёўскай абласцей.

Удзельнікі паходу правядуць мітынгі і ўскладуць памятныя карзіны да мемарыяльных комплексаў, брацкіх магіл салдат і мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, сустрэнуцца з ветэранамі вайны і працы, акажуць ім шэфскую дапамогу. Таксама яны наведаюць установы адукацыі, дзе правядуць прафарыентацыйныя сустрэчы са старшакласнікамі, выступяць з канцэртамі, арганізуюць майстар-класы, спартыўныя мерапрыемствы.

У паходзе прымуць удзел студэнты БДПУ з Беларусі, Туркменістана, Расіі і Кітая. Разам са студэнтамі і выкладчыкамі БДПУ ў паход таксама адправяцца студэнты і выкладчыкі Бакінскага славянскага ўніверсітэта (Азербайджан), Еўразійскага нацыянальнага ўніверсітэта імя Л. М. Гумілёва (Казахстан), Маскоўскага гарадскога педагагічнага ўніверсітэта (Расія), Ташкенцкага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Нізамі (Узбекістан).

Мітынг, прысвечаны старту 54-га інтэрнацыянальнага Зорнага паходу, адбудзецца 28 студзеня ў музейна-паркавым комплексе «Перамога» каля памятнага знака ў гонар грамадзян усіх нацыянальнасцяў, якія вызвалялі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У мерапрыемстве прымуць удзел міністр адукацыі нашай краіны Ігар Карпенка, прадстаўнікі пасольстваў Азербайджана, Казахстана, Расіі, Туркменістана, Узбекістана і Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Справы маладых*

# Калі і камандзір, і атрад — найлепшыя

**Кацярына СЕНАЖАЦКАЯ, другакурсніца Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, улетку шчыравала на роднай Любаншчыне, у лагеры «Арэса». Яна ўзначаліла атрад «Арэскі дазор» мясцовага тэрытарыяльнага штаба студэнцкіх атрадаў БРСМ. Яе калегамі былі землякі-аднагодкі, якія вучацца ў педагагічным, эканамічным універсітэтах. Разам яны перамаглі на абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр — 2018» у намінацыі «Найлепшы студэнцкі атрад». А сама дзяўчына стала найлепшым камандзірам у адпаведнай намінацыі.**



— Калі ехала ў лагер, — успамінае Каця, — вельмі хвалявалася: ці паладжу з дзецьмі. Першыя два дні было пэўнае напружанне: хацелася зрабіць як мага больш і лепш. Аднак, калі паглыбілася ў працэс, праца пачала падабацца. У гэтым дапамагала мая выдатная каманда ініцыятыўных, крэатыўных і пазітыўных — такіх жа студэнтаў, як і я. Кожны дзень мы збіраліся на сустрэчу і размяркоўвалі абавязкі на мерапрыемствы. Я, як педагог-арганізатар, пісала сцэнарый, хтосьці быў вядучым, хтосьці проста дапамагаў.

Усе фотаздымкі, відэазапісы, справаздачы я сабрала ў адмысловы журнал. Мяркую, што яго і ацаніла журы конкурсу, калі выбірала пераможцаў...

А мерапрыемстваў было — не злічыць. Кожнае пачыналася з флэшмобу — танцавальных рухаў, якія трэба было паўтараць за важатымі. Быў і асобны танцавальны дзень, дзе спаборнічалі ўжо атрадамі. Праводзіўся «Фотакрос» — конкурс на самы лепшы фотаздымак на фоне пэўных месцаў у лагеры, якія трэба было знайсці. Ладзілі нават баль-маскарад! Таксама адметным стаў дзень Алімпійскіх гульняў, у які дзеці і важатыя ставілі сцэнкі пра багоў, гулялі ў водныя баі (абліваліся з вадзяных пісталетаў і бутэлек), займаліся спортам. Ідэі прыдумлялі самі студэнты, абапіраючыся на ўласны досвед. Кацярына, напрыклад, штосьці прыгадала са свайго дзяцінства: у школьныя гады яна хадзіла на танцы і займалася ў музычнай школе.

А яшчэ студэнтка вяла ў лагеры гурток па інтарэсах. Напачатку ў яго прыходзіла пятнаццаць-дваццаць чалавек, а напрыканцы ўжо было ажно семдзесят!

...Як найлепшы камандзір атрада, Каця дакладна ведае, якімі якасцямі ён павінен валодаць. «Самае галоўнае — пазітыў, — лічыць яна. — У вачах, у душы, у стаўленні да ўсяго. Канешне ж, адказнасць і стараннасць — без іх нічога не атрымаецца. А яшчэ важным з'яўляецца ўменне наладжваць стасункі з дзецьмі і старэйшымі».

Дзяўчына лічыць, што падчас змены ўсё атрымалася:

— Было столькі эмоцый, столькі пазітыву! Калі прыехала дадому, сказала: «Мама, хачу пяць дзяцей: двух хлопчыкаў і трох дзяўчынак». А ўсё з-за таго, што адчувала цеплыню і любоў выхаванцаў. Цяпер мы ўсе пазнаходзілі адно аднаго ва «УКантакце», стварылі суполку. Дзеці пішуць, плануюць новыя сустрэчы, віншуюць мяне. Некаторыя тэлефануюць. Нават дырэктар лагера пацікавіўся, ці прыеду наступным летам. А я адказала: «Вы толькі нікога не шукайце, я абавязкова вярнуся!»

**Юлія АДАМОВІЧ, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Актыўная пазіцыя*

# СТАЛАСЦЬ МАЛАДОСЦІ НЕ ПЕРАШКОДА

**У НАН Беларусі абраны новы склад Савета маладых навукоўцаў. У выніку адкрытага галасавання старшынёй Савета маладых навукоўцаў НАН Беларусі зноў абраны Андрэй ІВАНЕЦ — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі, доктар хімічных навук.**




Штогод шэрагі супрацоўнікаў Акадэміі навук папаўняюць 300—350 маладых людзей. «У цяперашні час у арганізацыях НАН Беларусі працуе каля 2,2 тысячы маладых спецыялістаў: гэта больш за чвэрць складу вучоных НАН Беларусі, — адзначыў на пасяджэнні агульнага сходу **старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Уладзімір ГУСАКОЎ**. — І маладыя павінны займаць актыўную пазіцыю. Трэба сказаць, што Савет маладых вучоных НАН Беларусі праявіў сваю сталасць, правёў шмат знакавых мерапрыемстваў. Гэта сур'ёзная арганізацыя, якая спраўляецца з адказнымі і важнымі даручэннямі. Мы ўскладаем на моладзь вялікія надзеі».

Сярод мерапрыемстваў, праведзеных Саветам маладых вучоных у 2018 годзе, — першы «Фестываль навукі — 2018», школа маладога вучонага «Вучоны пад ключ», міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Моладзь у навуцы — 2018», чацвёрты Міжнародны студэнцкі турнір па хіміі, фізіцы, біялогіі, гісторыка-культурнае мерапрыемства «Сцежкамі продкаў», мерапрыемствы па ўшанаванні памяці выдатных акадэмічных навукоўцаў і іншыя. З мэтай прыцягнення школьнікаў да навуковай працы Саветам маладых вучоных НАН Беларусі арганізавана праца сямі «Школ юных даследчыкаў».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Знайсці сябе*

# КАЛІ ЎСЁ СКЛАДВАЕЦЦА Ў АДНУ КАРЦІНУ

## І не толькі ў акварэлі і каліграфіі

**Юлісіс Неўмер, ураджэнка Гомеля, — удзельніца і пераможца рэспубліканскіх і міжнародных выставак. У 2016 годзе яна нават увайшла ў спіс 100 найлепшых мастакоў свету! Зараз Юлісіс (або проста Юля, калі забыцца на творчы псеўданім) жыве ў Мінску і працуе ва ўласнай студыі акварэлі і каліграфіі. Пра шлях да статусу паспяховай мастачкі мы і вырашылі даведацца ў нашай гераіні.**

— Калі мне было сем гадоў, мама звярнула ўвагу на тое, што дачка любіць маляваць. Таму наступныя дзесяць гадоў я хадзіла ў мастацка-архітэктурную школу. Параіўшыся з бацькамі, падала дакументы ў Гомельскі мастацкі каледж на факультэт жывапісу. Але з першага разу паступіць не атрымалася: быў велізарны конкурс, больш за дзесяць чалавек на месца. Знервавалася, затое лепш рыхтавалася да другой спробы на наступны год. Вынік — маё залічэнне, — прыгадвае суразмоўніца. — Шчыра кажучы, гэта былі самыя шчаслівыя чатыры гады ў жыцці, якія перавярнулі светапогляд. Кожны дзень мы праводзілі ў майстэрні, асвойвалі жывапіс. Калі многія знаёмыя з іншых навучальных устаноў прагульвалі пары, мы сваё чакалі з нецярпеннем. Знаходзіцца побач са сваімі аднадумцамі, развівацца разам, святкаваць перамогі, удзельнічаць у конкурсах, рабіць выстаўкі — усё гэта было вельмі крута.

Веды, атрыманыя Юліяй у каледжы, дапамагалі ёй выпрацаваць свой стыль у маляванні, вылучыць напрамкі, якія падабаюцца. Напрыклад, падчас вучобы яна шмат увагі аддавала стрыт-арту. Выступала на розных фестывалях вулічнага мастацтва, дзе была ледзьве не адзінай дзяўчынай сярод хлопцаў. Да таго ж выконвала індывідуальныя заказы ад розных фірмаў, малявала ілюстрацыі ў часопісы, коміксы, партрэты. Такім чынам на чацвёртым курсе пачала зарабляць на творчасці больш за сваіх бацькоў.

— Я не з тых людзей, якія ўпэўнены, што талент — гэта галоўнае. У наш час лепш быць мэтанакіраваным, працавітым і актыўным, — гаворыць Юля. — Той, хто баіцца




адпраўляць заяўкі на конкурсы, знаёміцца з людзьмі, хто сядзіць у чатырох сценах, не дасягне поспеху. Нельга трымаць у галаве думку «не змагу». Трэба заўсёды ставіць перад сабой складаныя задачы. Чаго баяцца? І калі сусвет дае табе шанц, чаму б ім не скарыстацца, нават калі гэтая спроба будзе няўдалай.

Пасля навучання ў Гомелі дзяўчына планавала пераехаць у Мінск, бо там былі і шматлікія заказы, і яе каханне. Але два гады павінна была адпрацаваць у школе.

— Было складана звыкнуцца з гэтай думкай, але я па жыцці аптыміст, таму знайшла для сябе самае станоўчае ў адпрацоўцы, што можа быць, — стасункі з дзецьмі. Я даносіла да іх сваё разуменне густу, эстэтыкі ў творчасці, а яны, у сваю чаргу, дастаўлялі мне радасць сваімі работамі. Дарэчы, з вучнямі і зараз падтрымліваю цёплыя стасункі, — дзеліцца мастачка.

Пасля некалькі гадоў яна працавала самастойна, на фрылансе. Юлю гэта цалкам задавальняла, але праз некаторы час надакучыла, і дзяўчына вырашыла штосьці змяніць. Тым больш многія знаёмыя прасілі яе, каб навучыла іх жывапісу.

— Стварала ўсё сваімі рукамі, дапамагаў любімы муж. Такім чынам у 2017 годзе і з'явілася ўласная студыя акварэлі і каліграфіі. Чаму выбрала такі вузкі напрамак? У Мінску існуе шмат студый па жывапісе, а я хацела вылучыцца, — дзеліцца Юля. — Радуе, што за час існавання студыі аўдыторыя вырасла ў дзясяткі разоў, кожны дзень тут кіпіць праца, гэта натхняе. Мая студыя — мой другі дом, поўны святла і ідэй, яна такая па-жаночаму мілая... Не дзіўна, што да мяне прыходзяць у асноўным дзяўчаты, хаця ў апошні час наведваюцца і хлопцы.

**«Нельга трымаць у галаве думку «не змагу». Трэба заўсёды ставіць перад сабой складаныя задачы. Чаго баяцца?»**

У дзяўчыны свая сістэма малявання. Калі гаворка ідзе пра паперу, яна працуе толькі пры натуральным дзённым святле. А на планшэце — у любы час. Таксама для мастачкі важна, каб падчас працэсу была поўная цішыня. Нават калі выбірала памяшканне для студыі, хацела, каб яна знаходзілася далей ад «цывілізацыі». Да таго ж суразмоўніца не з тых мастакоў, якія працуюць у так званым творчым беспарадку. Бруду не пераносіць ні ў малюнку, ні ў жыцці.

— Чалавек, які хоча чагосьці дасягнуць у жыцці, абавязкова будзе рухацца наперад. Гэтага прынцыпу прытрымліваюся заўсёды, таму ўжо маю вопыт арганізацыі майстар-класаў па жывапісе, выставак, валодаю майстэрствам упрыгожвання малюнкамі адзення, сцен будынкаў. Люблю ўдзельнічаць у розных цікавых праектах. Мяне вельмі натхняюць вандроўкі, знаёмствы з паспяховымі людзьмі, — кажа Юля. — Калі б не стала мастачкай? Займалася б сацыяльнымі праектамі. Вельмі люблю жыццё і зараз трымаю ў галаве думкі аб арганізацыі шэрагу дабрачынных мерапрыемстваў, скіраваных на паляпшэнне ўмоў утрымання жывёл у прытулках.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# ЁСЦЬ КАНТАКТ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— На пачатку дзяжурства я праводжу агляд абсталявання падстанцыі, запісваю ў аператыўны журнал, у якім стане прымаю змену, дакладваю пра гэта дыспетчару. Звычайна ўсё праходзіць ціха — не кожны дзень тут штосьці здараецца.

Сярод пазаштатных сітуацый, з якімі даводзіцца сутыкацца: кароткае замыканне на лініі. Здаралася, і падстанцыя цалкам гасла. Але чыгунка ў такім выпадку не спыняецца: кантактную сетку хутка забяспечваюць энергіяй з рэзервовых крыніц.

Лінію можа пашкодзіць моцны вецер ці навальніца. Маргарыта ўспамінае, як гады два таму вясной быў ураган, які паваліў шмат дрэў і паабрываў правады. Тады цягнікі стаялі. Але звычайнае пашкоджанне на лініі затрымлівае цягнік толькі на 10—15 хвілін. Аварыйная брыгада выязджае хутка: у яе стаіць мэта ліквідаваць усе непаладкі максімум за гадзіну.

Маргарыта пераапранаецца ў спецадзенне і выходзіць на вуліцу. Хутка павінны прыехаць рабочыя, і ёй трэба падрыхтаваць для іх рабочае месца. Дзяўчына абсточвае ўчастак, які будуць рамантаваць, і праводзіць зазямленне. Каб праверыць, ці ёсць напружанне, яна падносіць спецыяльны паказальнік: калі ток застаўся, прыбор пачне пішчаць. Усе свае дзеянні электрамеханік запісвае ў бланк і ставіць насупраць кожнага подпіс: так патрабуюць правілы бяспекі, нельга спадзявацца толькі на памяць.

Праз пэўны час раздаецца сірэна — апавяшчае, што на падстанцыі звоніць тэлефон. Маргарыта спяшаецца ў будынак і здымае трубку.

— На адным з участкаў будуць весціся работы, таму мяне прасілі вывесці аўтаматычнае паўторнае ўключэнне. Гэта трэба, каб, калі раптам штосьці здарыцца, уключальнік у нас зноў не падаў напружанне, — тлумачыць пасля званка дзяўчына і націскае кнопку на адной з жалезных «шаф». А пасля вешае туды папераджальную таблічку — дадатковае напамінанне лішнім не будзе.

Пытаемся пра складанасці ў рабоце.

— Мне бывае цяжка фізічна штосьці зрабіць: зазямленне, напрыклад, або цялежкі выкаціць. Часам і мужчынам з гэтым няпроста справіцца, — заўважае суразмоўніца.

На работу яна дабіраецца на электрычцы: Маргарыта жыве ў пасёлку Негарэлае Дзяржынскага раёна, за 50 кіламетраў ад Мінска. «У нас звычайны дом, без выгод, таму даводзіцца і дроў прынесці, і вады набраць, і памыць адзенне ўручную. Жыццё мяне ў цяжкасцяў падрыхтавала», — смяецца дзяўчына.

У вольны час электрамеханік сядзіць за канспектамі (завочна вучыцца на энергетычным факультэце ў БНТУ) і спявае. Дзякуючы свайму таленту Маргарыта стала «Міс Мінскага аддзялення чыгункі» ў 2015 годзе, выступала на адной сцэне з зоркамі беларускай эстрады. А аднойчы пасля канцэрта ў роднай вёсцы ёй нават работу хацелі прапанаваць — у Доме культуры суседняга пасёлка Энергетык. На пытанне, чаму не звязала прафесію з музыкай, дзяўчына жартуе: «У нас так казалі: каб працаваць у гэтай сферы, трэба або быць віртуозам, або больш нічога не ўмець».

Сваёй цяперашняй працай Маргарыта задаволена. Да начных змен і лёгкага гулу абсталявання ў кабінеце таксама прызвычаілася. А па абцасах і спадніцах (на дзяжурстве ж звычайна даводзіцца быць у спецадзенні і касцы) не сумуе — пачакаюць да наступнага канцэрта.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**




Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

На ўчастак, дзе абсталяванне працуе пад напружаннем, — толькі ў спецадзенні і касцы.

# «ЛАЙКІ» ЗА «ЛУКІ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Валерыя ДЭЛЬ, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта БДУ:**



— Вяду «Інстаграм» ужо чатыры гады. Раней мой профіль быў у стылі «я і сябры», зараз яго накіраванасць змянілася. Я падпрацоўваю мадэллю, выкарыстоўваю сацыяльную сетку для ўласнай рэкламы. Каб ацаніць знешнія даныя, людзі ў першую чаргу глядзяць фота ў «Інстаграме». У мяне ёсць мэта набраць як мага больш падпісчыкаў. Гэта крутая платформа для мадэльнага бізнесу. Тым больш рэкламныя прапановы прыносяць нядрэнны заробак.

**«Займаюся бегам і шмат пішу пра гэта ў сацыяльнай сетцы. Часта чую: «Ты так матывуеш!» Прыемна быць камусьці карысной».**

Я часта прашу сяброў мяне сфатаграфаваць. Пры гэтым сама выстройваю сабе кадр — іншым дастаткова націснуць на кнопку. Аднак ім мае просьбы ўсё роўна дакучаюць. На «Інстаграм» я трачу не больш за гадзіну ў дзень: не гартаю стужку, заходжу толькі на профілі, якія мне цікавыя. Напісанне чарговага паста і апрацоўка фота займаюць каля 40 хвілін. Калі паглядзець статыстыку профілю, то 55 працэнтаў маіх падпісчыкаў — дзяўчаты ад 18 да 20 гадоў. Сярод аўдыторыі як знаёмыя, так і людзі з іншых гарадоў і нават краін. Думаю, мая старонка папулярная, бо ў мяне незвычайная знешнасць: рыжыя валасы, вяснушкі.

Некаторыя лічаць: «раскруціцца» з дапамогай фотаздымкаў — што за глупства? Але гэта таксама і праца. Без пастаяннага вывучэння аўдыторыі, творчага мыслення нічога не атрымаецца. Таму я паважаю папулярных інстаграм-блогераў, натхняюся іх поспехамі. «Інстаграм» — гэта латарэя. Так, ты можаш размяшчаць прыгожыя здымкі, пісаць цікавыя тэксты. Але з-за таго, што сацыяльныя сеткі перанасычаны інфармацыяй, цябе не заўважаць. Няма ўніверсальнай парады па развіцці профілю. Проста рабі, што падабаецца, і твая аўдыторыя цябе знойдзе.

**«У чалавека шмат падпісчыкаў — значыць, ён класны. Але калі на профіль падпісалася тры тысячы чалавек, сяброў у мяне не стала больш».**

**Ангеліна ДРАБУДЗЬКА, студэнтка III курса юрыдычнага факультэта БДУ:**



— Спачатку завяла «Інстаграм», бо гэта было модна. Пазней ён стаў месцам, дзе я дзялюся думкамі і важнымі момантамі ў жыцці. Напрыклад, займаюся бегам і шмат пішу пра гэта ў сацыяльнай сетцы. Часта чую: «Ты так матывуеш!» Прыемна быць камусьці карысной. Таксама на прасторах «Інстаграма» расказваю пра сваё стаўленне да жыцця, лёсу. З аднаго боку, не варта перагружаць людзей інфармацыяй, але з другога — подпіс да фота павінен быць цікавым. Калі яго няма наогул, ствараецца ўражанне, што чалавек пусты і яму няма чаго сказаць.

**«Зараз меркаванне пра чалавека складаецца дзякуючы сацыяльным сеткам. Заваяваць увагу аўдыторыі не так проста».**

Два гады таму колькасць маіх падпісчыкаў рэзка ўзрасла. Не ведаю, з чым гэта звязана. Бывае, размяшчаеш дзве фатаграфіі: адна збірае пяцьсот «лайкаў», другая — у два разы менш. Гэта не значыць, што здымак непрыгожы. Проста ты альбо трапіў у «інстаграмную» хвалю, альбо не. Я вяду «Інстаграм» для сябе. Калі робіш гэта дзеля чужой увагі і не атрымліваеш яе ў поўнай меры — толькі дарэмна засмучаешся. З большасцю падпісчыкаў я знаёмая асабіста. Праз яго знайшла новых сяброў. Сустракалася з імі ў рэальным жыцці, і нам было пра што пагаварыць. Зараз сацыяльныя сеткі збліжаюць: так можна і свой лёс праз іх сустрэць.

Я аднолькава люблю быць як мадэллю, так і фатографам. У маім профілі з'яўляюцца і сэлфі, і прырода, і гарадскія пейзажы. Часам мы з сяброўкамі арганізоўваем фотасесіі спецыяльна для «Інстаграма». Выбраць той самы здымак, які будзе ў профілі, — праблема нумар адзін. Тут без парады сяброў не абысціся.

У сацыяльных сетках амаль ніхто не паказвае сваё рэальнае жыццё. У мяне ж профіль сапраўдны — без ідэалізацыі таго, што адбываецца. Калі мне сумна, я пра гэта напішу. Зараз модна весці «Інстаграм» у адным стылі. Я так не магу, бо жыццё — цэлая палітра фарбаў. Ведаю, што ў некаторых з-за сацыяльных сетак пачынаюцца комплексы: нібыта яны жывуць не так добра, як іншыя. Я з гэтай нагоды не перажываю: упэўнена, у мяне ўсё цудоўна.

**Юлія ПАГАРЭЛЕЦ, студэнтка III курса МДЛУ:**



— Калі мне было 12 гадоў, я выкладвала ў «Інстаграме» ўсё без разбору. Вельмі люблю фатаграфаваць. Нават спецыяльна хадзіла на курсы, праводзіла для сяброў фотасесіі. Але аднойчы вырашыла, што павінна быць па той бок аб'ектыва. Тым больш здымкі са мной набіраюць больш «лайкаў».

Паўтара года таму ў галаве засела думка: у чалавека шмат падпісчыкаў — значыць, ён класны. Але калі на профіль падпісалася тры тысячы чалавек, сяброў у мяне не стала больш. Я не гналася за папулярнасцю. Проста так бывае: чалавек чагосьці моцна хоча, але гэта не здараецца. А калі стаўся спакойна, атрымліваеш часам «усё і адразу».

**«У мяне ёсць мэта набраць як мага больш падпісчыкаў. Гэта крутая платформа для мадэльнага бізнесу».**

Фатаграфіі я амаль не падпісваю, часцей за ўсё проста стаўлю смайлік. Не хачу навязваць сваё меркаванне або спрабаваць прыцягнуць увагу разумнай цытатай. «Інстаграм» стаў для мяне руцінай: любую вольную хвілінку праводжу там. Вядома, сачыць за чужым жыццём, забываючыся на сваё, — дрэнна. Аднак усе ўжо прызвычаіліся да сацыяльных сетак і дарогі назад няма. Я прытрымліваюся думкі, што шчасце любіць цішыню. Таму не выстаўляю ўсё напаказ.

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Адваротны бок медаля*

# СЭЛФІ: МОДА АБО ДЫЯГНАЗ?

**У наш час складана сустрэць дзяўчат (хлопцы тут у меншасці), якія б не «завісалі» ў інтэрнэце гадзінамі, разглядаючы чужыя фатаграфіі, любуючыся сваімі. Без сумнення, жаданне атрымліваць зваротную рэакцыю ў сацыяльных сетках, быць папулярным — глабальны феномен апошніх гадоў. Псіхіятры многіх краін бачаць у гэтым небяспеку. Сістэма працуе так: вы выкладваеце фатаграфію ў адкрыты доступ, атрымліваеце пэўную колькасць лайкаў. Мозг вылучае гармон радасці — дафамін, але на невялікі перыяд часу. Каб падоўжыць задавальненне, трэба яшчэ больш «сэрцайкаў». Рэальныя радасці адыходзяць на другі план: трэніроўкі ў спартзале ўжо здаюцца не такімі эфектыўнымі, ежа не такой смачнай, адносіны — не такімі рамантычнымі.**

Псіхолагамі ўстаноўлена, што звычайна на «сэлфізм», або залежнасць ад фатаграфавання, пакутуюць людзі, якім не хапае пазітыву і стасункаў у асабістым жыцці. Кожны лайк, пастаўлены пад фатаграфіяй, успрымаецца як аўтарам як адабрэнне. Страх быць адзінокім, непапулярным, непрызнаным спараджае імкненне рэкламаваць сябе. Такія людзі хочуць адчуваць сімпатыю, самасцвярджацца, часам — быць падобнымі на сваіх куміраў. Сэлфіманы марнуюць шмат часу на выбар месца, адзення, макіяж і прычоскі для фота, цяжка перажываюць крытыку, але адчуваюць эмацыянальны ўздым ад пахвалы і кампліментаў.

На што гатовыя пайсці карыстальнікі сацыяльных сецяў дзеля запаветных лайкаў? Па-першае, многія з іх рэтушуюць свае здымкі да непазнавальнасці: памяншаюць аб'ёмы таліі, адбельваюць зубы, павялічваюць вусны. Калі сустрэнеш такога чалавека на вуліцы, ёсць вялікая імавернасць яго не пазнаць. Па-другое, шмат часу і грошай яны выдаткоўваюць на апрацоўку кадраў: цяпер некаторыя праграмы для гэтага платныя. Да таго ж пакуль падбярэш «ідэальны» фільтр, наладзіш святло і колеракарэкцыю, пройдзе процьма часу.

Каб выйгрышней выглядаць у камеры мабільнага тэлефона, некаторыя дзяўчаты і хлопцы сядзяць на жорсткіх дыетах, пазбаўляючы сябе ежы і нават вады. Дзеля пацвярджэння ўласнай прывабнасці асабліва адважныя прыхільнікі сацсетак робяць пластычныя аперацыі (нават у юным узросце), апранаюцца не па надвор'і, а таксама выстаўляюць шматлікія фатаграфіі ў сподняй бялізне: найлепшы спосаб прыцягнуць увагу да сваёй персоны — раздзецца.

Часам для таго, каб дамагчыся ідэальнага ракурсу, карыстальнікі сацыяльных сетак літаральна прымушаюць сваіх блізкіх фатаграфаваць іх на кожным кроку. Ну а калі побач нікога няма, на дапамогу «фотаманам» можа прыйсці адна паслуга. Сутнасць простая: яны бяруць напракат велізарныя букеты руж і фірмовыя пакеты. Кур'ер дастаўляе кветкі і іншы неабходны «інвентар», чакае, пакуль кліент гэта сфатаграфуе, а пасля забірае і адвозіць да наступнага. Ёсць нават акаўнты, якія прапануюць здымкі з мужчынам у дарагой машыне! Усё — дзеля ўяўнай папулярнасці...

І не зусім добры прыклад тут часта паказваюць зоркі. Напрыклад, балерына Анастасія Валачкова для свайго фірмовага шпагату лунала над абрывам, Цімаці плаваў з акулай, Сацi Казанава гайдалася над цяснінай у інданезійскіх джунглях на арэлях.

Але ёсць і больш сур'ёзныя выпадкі. Па ўсім свеце з-за жадання вылучыцца штогод атрымлівае траўмы і гіне шмат людзей, напрыклад, у 2015 годзе пры экстрэмальных здымках развіталася з жыццём больш чалавек, чым ад нападзення акул. Ёсць яшчэ і тыя, хто не супраць зрабіць фатаграфію за рулём. Каб абараніцца ад такіх гора-кіроўцаў і адначасова прыцягнуць да гэтай праблемы ўвагу масавай аўдыторыі, у розных краінах ствараецца папераджальная відэаролікі і сацыяльная рэклама.

Шмат такіх прыкладаў небяспечных паводзін можна прывесці і ў нашай краіне. Хлопец у Гомельскай вобласці хацеў зрабіць сэлфі на фоне трансфарматарнай падстанцыі. Яму дыягнаставалі паражэнне электратокам, апёкі галавы і кісцей рук. У Рэчыцкім раёне 17-гадовая дзяўчына выпала з акна закінутага завода: студэнтка выбрала ўдалы, на яе погляд, ракурс, але не ўтрымала раўнавагу. Прызямленне з шасціметровай вышыні скончылася пераломам галёнкі і траўмай пазваночніка...

З-за празмернага захаплення «Інстаграмам» можа пацярпець і асабістае жыццё. Да такой высновы ў 2016 годзе прыйшлі амерыканскія навукоўцы з універсітэта Фларыды. Даследаваўшы гісторыі 420 добраахвотнікаў, яны высветлілі, што чым больш асабістых кадраў з'яўляецца ў сацыяльных сетках, тым большая рызыка канфлікту ў рамантычных адносінах.

**Дар'я ШЛАПАКОВА, студэнтка IV курса факультэта журналістыкі БДУ.**

*Нечакана!*

# Наняць... інстаграм-няню

**Незвычайную паслугу кліентам пачала прапаноўваць з лістапада мінулага года сетка гатэляў у Швейцарыі: магчымасць скарыстацца паслугамі інстаграм-сядзелкі.**

У той час як гасцініцы па ўсім свеце імкнуцца, каб пастаяльцы расслабляліся, адмовіўшыся ад гаджэтаў, швейцарцы, разумеючы, што такое, напэўна, наўрад ці магчыма, знайшлі незвычайны спосаб прымусіць кліентаў адарвацца ад экранаў. Яны прапануюць наняць інстаграм-няню, якая зоймецца абнаўленнем акаўнта госця, пакуль той адпачывае ад любых электронных устройстваў. На думку аўтараў ідэі, гэта дапаможа людзям пазбавіцца ад стрэсу, які ўзнікае пры актыўным жыцці ў сацыяльных сетках (ці не ад стрэсу ад адсутнасці чалавека ў іх?). З гэтай нагоды звярнуліся па дапамогу да дзясяткаў папулярных блогераў, якія і павінны падчас усяго водпуску кліента выкладваць за яго фота, запісваць гісторыі, а таксама адказваць на асабістыя паведамленні і каментарыі. У кожнага эксперта ёсць свая спецыялізацыя — прыгожыя месціны, падарожжы, мода, стыль жыцця, культура і мастацтва, прырода, ежа і, як паведамляецца, нават ёга. З нагоды запуску новай паслугі быў запісаны рэкламны ролік пра мопса-падарожніка. Апроч сэлфі, сабака «расказваў» пра тое, як прайшоў яго дзень і дзяліўся фатаграфіямі «сяброў».

Дарэчы, летась жа на адным з курортаў на Мальдывах з'явіліся... інстаграм-дварэцкія. У іх абавязкі ўваходзіць знаёмства кліентаў гатэля з самымі лепшымі месцамі для фатаграфавання, а таксама суправаджэнне па спецыяльным маршруце, які ўключае ў сябе галоўныя месцы для сэлфі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Открытое акционерное общество «Сантехэлектромонтаж», расположенное по адресу: 246007, г. Гомель, ул. Троллейбусная, 8-А, настоящим информирует, что на основании решения наблюдательного совета от 17 января 2019 года осуществляется формирование реестра акционеров общества по состоянию на 7 февраля 2019 года для проведения очередного общего собрания акционеров 1 марта 2019 года.

УНП 400052115

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
# «АВТО ОТ МАСТЕРКАРД. ФЕВРАЛЬ»

**1. Организатор Рекламной игры**

Закрытое акционерное общество «Сэлмон-Графикс» (далее – Организатор), УНП 100843219, адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43.

Заинтересованным лицом Рекламной игры является: общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Заинтересованное лицо).

